Пралетарыі ўсіх краёў, злучайцеся!

Савецкая Беларусь

Орган Цэнтральнага Выканаўчага Камітэту Саветаў БССР.

КОШТ НУМАРУ 5 кап.

АДРЭС РЭДАКЦЫІ: МЕНСК, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса (2-гі Дом Саветаў).

ТЭЛЕФОНЫ: Рэдакцыі—№ 478. Рэдактара—№ 769.

Матар'ял прымаецца—з 9-й да 3½ гада.

Навыкарыстаныя рукапісы назад аўтарам не вяртаюцца.

КАНТОРА: Менск, рог вуліц Ленінскай і Карла Маркса. Тэлефон № 244. (2-гі Дом Саветаў).

ПАДПІСНАЯ ПЛАТА: На 1 месяц . . . . — 90 к. „ 3 „ . . . . 2 р. 70 к. „ 6 „ . . . . 4 р. — к. „ 1 год . . . . 8 р. — к. Зьмена адрасу: іншагародняя — 20 к. мясцовыя . . . . — 10 к.

ПЛАТА ЗА АБВЕСТКІ: За радок шпальтэ пасьля тэксту — р. 50 к. За радок шпальтэ пасярод тэксту 1 р. — к. За радок шпальтэ перад тэкстам 1 р. 50 к. Сьвяшчыя на 50 проц. даражэй. Звыш тарыфу бярэцца 10 проц. налогу.

ПЛАТА ЗА ПУБЛІКАЦЫІ: За 1 дакумент . . . 35 кап. За кожны дадатковы . . 15 „ Беспрацоўн. і чырвонаармейцы за дакумент . . 15 „ За кожны дадатковы . . 5 „ Публікацыі ЗАГС'у—3 руб.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА ў канторы газэты, ва ўсіх аддзяленьнях Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва і ва ўсіх пашт.-тэл. канторах. АБВЕСТКІ ПРЫМАЮЦЦА канторай газэты: Менск, рог Ленінскай і Карла Маркса (2-гі дом Саветаў).

9 ГОД ВЫДАНЬНЯ. ШТОДЗЁННАЯ ГАЗЭТА. № 255 (2443) Субота, 3-га лістапада 1928 г.

Аб працы з беднатою.

Масква, «Правда» ў перадавіцы пад загалоўкам «О работе с беднотой» піша:

Мы маем на вёсцы абвастрэньне клясавае барацьбы: кулацтва актыўна перашкаджае правядзеньню мерапрыёмстваў савецкае ўлады па абмежаваньні капіталістычных элементаў вёскі і па разгортваньні сацыялістычнага сэктару ў сельскай гаспадарцы. Мы наглядаем у некаторых раёнах (Сібір, Паволожжа, Украіна) усё больш частыя выпадкі падпалу кулакамі калгасаў, псаваньня імі грамадзкіх машын; больш таго, мы маем рост нападаў кулацкіх элементаў і іх падручных на актыўных грамадзкіх працаўнікоў-беднякоў.

Адзначаючы рост актыўнасьці кулацкіх элементаў і іх вельмі актыўную барацьбу—часам разумную, хітрую—заўмацаваньне сваіх пазыцый на вёсцы, за ўзмацненьне свайго ўплыву ў саветах, кааперацыі, мы ў той жа час павінны адзначыць нездавальняючы адпор в боку партыйных і камсамольскіх арганізацый і беднаты гэтым спробам кулацтва. Праца сярод беднаты не адпавядае тым запатрабаваньням якія партыя павінна высунуць у сучасны перыяд. Сярод саміх партыйных арганізацый мы маем нярэдка недаацэнку ўсяе важнасьці справы арганізацыі беднаты, як палітычнае апору на вёсцы. З аднаго боку; у вясковых ячэйках назіраюцца элементы, якія вулучаюцца з кулацкай верхавінай і трымаюць пад яе ўплыў. З другога боку, сярод асобных праслоек нашых вясковых партыйных арганізацый, асабліва сярод абіракрачаных элементаў савецкага апарату, мы наглядаем ухіл у бок адміністраваньня і камандаваньня, няўмелыя спробы вырашыць складанае пытаньне перамогі капіталістычных элементаў на вёсцы адміністрацыйнымі мерамі. Іншы раз гэты ўхіл выяўляецца ў тэндэнцыях выразнага раскулачваньня. Пры гэтым горш усяго тое, што адначасна гэтыя адміністрацыйныя меры, вельмі часта в прычыны няведаньня канкрэтнага клясавага ворага на вёсцы, б'юць ня толькі па кулаку, але вельмі часта такіма і па серадняку, а іншы раз і па беднаняку. Зусім вразумела, што без перамогі гэтых абодвых ухілаў партыйных арганізацый немагчыма паставіць на адпаведную вышыню працу па згуртаваньні бядняцка-серадняцкага блёку проці кулацтва.

Задачу выхаваньня батрацка-бядняцкага актыву і адбору перадавых элементаў яго ў партыю, а таксама ў камсамол трэба высунуць у практычнай працы на першы плян, як першачарговую, баявую задачу. Іменна праз аздараўленьне сацыяльнага складу партыйных і камсамольскіх ячэек на вёсцы можна дапамагчы зьнішчэньню няправільных ухілаў у працы нізавых партыйных арганізацый і ўмацаваць сувязь іх з бядняцкімі коламі вёскі.

Нашая задача ў тым, каб, узмацняючы актыўнасьць і згуртаванасьць найбольш блізкіх пралетарыяту бядняцкіх колаў вёскі, дамагчыся ў яшчэ большай меры ўзмацненьня свайго ўплыву ва ўсёй сялянскай масе. Трэба загэтым зьвязаць працу в беднатою з разгортваньнем наогул масавае палітычнае працы на вёсцы. Вельмі важным зьяўляецца арганізаваны ўдзел бядняцкіх груп на сельскіх сходах, у совецкіх саветаў і інш. Самым значным мэтаімкненьнем арганізаванае беднаты і батрацтва павінна быць палепшаньне дзяржаўнага апарату, яго ачыстка ад сацыяльна-чужых кулацкіх элементаў і вылучэньне новых праверэных кадраў в працоўных мас сялянства. Беднаце трэба мабілізавацца ня толькі ідэёва-палітычна, але і арганізацыйна, загадзя падрыхтаваўшы свае сьпісы кандыдатаў, загадзя вядучы агітацыю ў сялянскіх масах ня толькі за агульныя палітычныя лёзунгі партыі, але і за сваіх кандыдатаў.

У сьвятле гэтых задач, агляд груп беднаты, які праводзіцца водлуг пастановы ЦК, набывае асаблівае палітычнае значэньне, бо ён прыцягвае ўвагу ўсяе савецкае грамадзкасьці да вясковае працы. Агляд груп беднаты павінен быць сапраўдным правядзеньнем у жыцьцё лёзунгу самакрытыкі і ў той-жа час павінен даць рашучы адпор антысавецкай крытыцы кулацкіх элементаў.

Апартуніст Брандлер ставіць сябе па-за кампартыяй.

БЭРЛІН, 30-X. „Форвэрто" паведамляе што Брандлер вярнуўся ў Нямеччыну.

„Ротэ Фанэ" наконт гэтага паведамленьня завуяне, што, калі правыя элементы, якія згуртаваліся вакол Тальгеймэра і Брандлера, з прычыны іх выразна фракцыйных і антыпартыйных выступленьняў Апроч таго, камітэт патрабуе вылучыць Гаўзэна і Гальма.

УДАР ПА ПРАВЫХ РАСКОЛЬНІКАХ.

БЭРЛІН, 1-XI. Канфэрэнцыя актыву Берлінскае арганізацыі кампартыі 800 галасамі проці 84-х згадзілася в вядомкаю кампаніі за ўсенародзнае галасаваньне і забарону пабудовы панцырнага кройсэра „А", прапанаванаю акруговым камітэтам.

Усімі галасамі проці 66-ці канфэрэнцыя ўхваліла прапанову Нойкольнскае падрайённае арганізацыі, якая патрабуе, каб ЦК УсеКП(б) ужыў дысцыплінарныя захады проці Брандлера, які парушыў партыйную дысцыпліну. Прымірэнцы галасавалі з правымі.

Японія спыніла перамовы з Нанкінам?

ПЕКІН, 1-XI. Японскае агенцтва Дэмпо распаўсюджвае чуткі, нібыта японскія мілітарысты ўхвалілі спыніць перамовы з Кітаем і назаўсёды акупаваць Шандуньскую правінцыю.

АНТЫЯПОНСКІ НАСТРОЙ ЖЫХАРСТВА МАНЧЖУРЫІ.

ПЕКІН, 1-XI. Вайсковы аташэ японскае місіі генэрал Тацекава вярнуўся ў Пекін з падарожжа па Шандуньскай правінцыі і Манчжурыі. У гутарцы з прадстаўнікамі друку Тацекава заявіў, што жыхарства Гірыну (адна з манчжурскіх правінцый) настроена варожа ў адносінах да японцаў. Аднак, Тацекава выказаў надзею, што гэты настрой з часам зьнікне, калі манчжурскае жыхарства ўпэўніцца, што Японія ня мае дрэнных намераў.

Закранаўшы пытаньне аб эвакуацыі Шандуньскае правінцыі, генэрал Тацекава заявіў: «Калі адразу эвакуаваць японскае войска з Шандуню, дык кітайскае жыхарства можа спагнаць свае пачуцьці на японскіх грамадзянах, якія жывуць у Шандуні. З гэтае прычыны лепш эвакуаваць японскае войска паступова».

Голад ва Ўсходняй Румыніі.

ВЕНА. Лідэр нацыянальна-сялянскае партыі Румыніі Маніу зрабіў падарожжа па Бэсарабіі. Вярнуўшыся ў Бухарэст, Маніу ў гутарцы з супрацоўнікам «Адэвэрул» паведаміў, што голад пануе ня толькі ў Бэсарабіі, але і ў шмат-якіх паветах Малдавіі.

Газэта зазначае, што Маніу каштавала шмат сілы атрымаць дазвол на падарожжа, у часе якога паліцыя сачыла за кожным яго крокам.

Забастоўка грэцкіх камунальнікаў.

АТЭНЫ, 31-X. Рабочыя электрычнае станцыі і трамваю абвяшчаюць сёньня забастоўку, бо ангельская кампанія, якой належаць гэтыя прадпрыёмствы, не згаджаецца павялічыць заработак. У забастоўцы возьмуць таксама ўдзел шофэры і кандуктары аўтабусаў кампаніі. Чыгуначнікі схіляюцца падтрымаць забастоўку.

Грэцыя сьпяшае аднавіць гандаль з СССР.

АТЭНЫ. Міністр замежных спраў Карапанос і міністр народнае гаспадаркі Вурлюміс абмяркоўвалі магчымасьць утварэньня гандлёвае згоды з СССР тэрмінам на 2 месяцы шляхам абмену нот. Утварэньне часовае згоды ня будзе азначаць перарыву распачатых 29-га кастрычніка перамоў а новым гандлёвым угаворы, якія будуць адбывацца далей, як ачуняе захварэўшы паўнамоцны прадстаўнік СССР.

Вялічэзны лёкаут пачаўся.

213.000 рурскіх мэталёўцаў выкінута фабрыкантамі на вуліцу

Згодніцкі прафсаюз падмагае капіталістам узяць бастуючых зморам.

СПРОБА НАДОЎГА ПАРАЛІЗАВАЦЬ РАБОЧУЮ КЛЯСУ.

БЭРЛІН, 1-XI. У кіруючых колах рэвалюцыйнае прафсаюзнае меншасьці зазначаюць, што лёкаут 213000 мэталёўцаў і барацьба тэкстыльшчыкаў і гарнякоў у Сілезіі зьяўляецца пачаткам надыходзячае сэрыі канфліктаў між працаю і капіталам. 1-га ліпеня 1929 г. зыходзіць тэрмін 93-х проц. усіх тарыфных угавораў, якія ахапляюць 5 з паловаю мілёнаў рабочых. Становішча характарызуецца няшчадным наступам прадпрыёмцаў, якія імкнуцца нанесьці рашучае паражэньне рабочай клясе, каб дамагчыся выгодных для сябе тарыфных згод на доўгі час. Прадпрыёмцы ідуць значна далей і імкнуцца да маральнага паражэньня рабочае клясы, каб парадзізаваць баявую здольнасьць рабочых мас на некалькі гадоў. З гэтаю мэтаю наступ прадпрыёмцаў накіроўвае непасрэдна проці прафсаюзаў і выкрывае прадажніцкую сутнасьць сыстэмы трацейскага разбору. Не зважаючы на гэта, рэфармісты не мабілізуюць рабочых мас, а зварочваюцца за дапамогаю проці прадпрыёмцаў да буржуазнае дзяржавы.

Камуністычная партыя і рэвалюцыйная прафсаюзная меншасьць заклікаюць нямецкую рабочую клясу распачаць пралетарскі контр-наступ проці паходу капіталістаў.

КАМПАРТЫЯ КЛІЧА ПАДТРЫМАЦЬ РУРСКУЮ СТАЧКУ.

Рэвалюцыйныя забастовачныя к-ты для кіраваньня стачкаю.

БЭРЛІН, 1-XI. Арганізацыя кампартыі ў Рурскай вобласьці агаласіла адозву да рабочае клясы па пытаньні аб канфлікце ў Рурскай мэталёпрамысловасьці. Адозва зазначае, што першачарговаю задачаю рабочае клясы ў Рурскай вобласьці зьяўляецца заснаваньне рэвалюцыйнага баявога кіраўніцтва на ўсіх прадпрыёмствах.

Рэвалюцыйныя забастовачныя камітэты павінны ўжыць захады, каб адхіліць штрэйкбрэхераўскія спробы, спыніць усю працу, у тыя ліку і падтрыманьне прадпрыёмстваў у стане тэхнічнае прыгоднасьці. Другая задача забастовачных камітэтаў—выставіць пікеты, заснаваць шчыльную сувязь з неарганізаванымі рабочымі, суседнімі прадпрыёмствамі і мэталёўцамі іншых прамысловых райёнаў.

Забастовачныя камітэты павінны наладзіць сувязь з камуністычнымі фракцыямі муніцыпалітэтаў в мэтаю атрымаць матар'яльную дапамогу бастуючым. Матар'яльна і маральна павінны падтрымаць бастуючых усе без выключэньня працоўныя Рурскае вобласьці.

Адозва зварачваецца да гарнякоў, транспартных рабочых і рабочых жыцьцёва неабходных галін вытворчасьці з заклікам падтрымаць бастуючых мэталёўцаў, бо паражэньне мэталёўцаў выкліча наступ прадпрыёмцаў на іншыя групы рабочае клясы.

Згоднікі дапамагаюць капіталістам.

БЭРЛІН. 1-11. У зьвязку з лёкаутам 213 000 мэталёўцаў згодніцкі прафсаюз мэталёўцаў абвясьціў, што будзе выдаваць дапамогу толькі сябрам саюзу. Такім парадкам, больш трох чвэртак лёкаутаваных будуць пазбаўлены дапамогі. Ухвалою такое пастановы саюз ідзе насустрэч прадпрыёмцам, якія імкнуцца ўзяць рабочых зморам.

У Саюзных Рэспубліках.

ДРЭННАЕ ВЫКАРЫСТОЎВАНЬНЕ СПЭЦЫЯЛІСТАЎ ПРАМЫСЛОВАСЬЦЮ.

(Вынікі абсьледваньня РСІ).

МАСКВА, 1-XI. Абсьледавацельская група НК РСІ СССР скончыла працу па праверцы выкарыстаньня інжынэрна-тэхнічных сіл, асабліва маладых тэхнічных кадраў, у прамысловасьці. Устаноўлена, што прамысловасьць надзвычайна слаба насычана інжынэрна-тэхнічнымі сіламі. Менш усяго забясьпечана імі тэкстыльная прамысловасьць. Да таго-ж сярод спэцыялістаў асобы з вышэйшай адукацыяй складаюць толькі 31 проц., з сярэдняю—28 процантаў і без спэцыяльнае—41 процант. Спэцыялісты вельмі малую частку свайго часу могуць аддаваць непасрэдна самой працы па вытворчасьці в-за перагрузкі іх адміністрацыйнымі абавязкамі і папяровакаанцэлярскаю працаю. Маладыя інжынэрна-тэхнічныя сілы выкарыстоўваюцца ў прамысловасьці бяз вучоту патрэбы выхаваць з іх кваліфікаваную тэхнічную вымену. Маладых інжынэраў або выкарыстоўваюць у заводзкай канторы, або назначаюць на адказную працу. Вельмі слаба практыкуецца пасоўваньне на службе асноўнага кадру спэцыялістаў.

Сярод інжынэрна-тэхнічнага складу, асабліва сярод тэхнічнае моладзі наглядаецца вялікая цякучасьць. Галоўнаю прычынаю, якая прымушае моладзь мяняць месца працы, зьяўляецца невыкарыстаньне яе па спэцыяльнасьці. Ніякае барацьбы в цякучасьцю тэхнічнага складу органы ВСНГ не праводзяць.

У вучоце і разьмеркаваньні спэцыялістаў няма ніякае сыстэмы, прычым самы вучот праводзіцца толькі колькасна, а ня якасна. Прыём спэцыялістаў аснован у значнай меры на асабовай сувязі і рэкамэндацыях. Адсутнасьць сыстэмы разьмеркаваньня і вучоту сапраўднае патрэбы зьяўляецца таксама аднаю з прычыны беспрацоўя сярод спэцыялістаў. Адарванасьць біржаў працы ад гаспадарчых органаў зьяўляецца прычынаю таго, што беспрацоўе не ліквідуецца.

Група НК РСІ СССР, якая праводзіла абсьледаваньне, распрацавала праэкт захадаў дзеля выкарыстаньня інжынэрна-тэхнічных сіл у прамысловасьці і, між іншым, дзеля ліквідацыі беспрацоўя сярод маладых спэцыялістаў.

КААПЭРАЦЫЯ Ў НОГУ З КАМСАМОЛАМ У КУЛЬТПАХОДЗЕ.

Масква, 1-XI. Праўленьне Цэнтрасаюзу ў лісьце да ўсіх зьвеньняў спажывецкае кааперацыі зазначае, што трэба ўзяць самы блізкі ўдзел у камсамольскім суботніку дапамогі школе. Спажывецкім саюзам цэнтральнае рабочае кааперацыі і адзіным спажывецкім таварыствам раіцца асыгнаваць з сваіх сродкаў спэцыяльныя сумы ў мясцовыя фонды камсамольскага суботніка для школьнага будаўніцтва, а таксама даваць моладзі і жадаючым дарослым, якія заняты ў гандлёвых і іншых прадпрыёмствах спажывецкае кааперацыі, звыш тэрміновую і зьдзельную працу на карысьць камсамольскага суботніку.

Далей у лісьце прапануецца вылучыць з культурна-бытавых фондаў кааперацыйных арганізацый ня менш 10-ці проц., для забясьпекі дзяцей пайшчыкаў—нізка-аплатных рабочых, парабкоў, бедных сялян—дармовымі ручнікамі, абуткам, вопраткаю і харчамі,—наладзіць гарачае сьнеданьне ў школах фабзавучу, фабрычна-заводзкай сямігодцы і буйных вясковых школах сямігодках і дзевяцігодках.

З свайго боку праўленьне Цэнтрасаюзу асыгнавала 20 тысяч рублёў у фонд камсамольскага суботніка для пабудовы фабрычна-заводзкае школы сямігодкі імя Цэнтрасаюзу.

Антыалкагольная дэманстрацыя пуцілаўцаў.

ЛЕНІНГРАД, 1-XI. Сёньня ў Ленінградзе адбылася першая антыалкагольная дэманстрацыя, наладжаная калектывам камсамолу «Чырвоны Пуцілавец». Дэманстрацыя была прыстасавана да дню выдачы заработку рабочым. Пасьля працы, як толькі скончылася выдача заработку, масы рабочых-пуцілаўцаў у ліку 1500 чалавек, разам з камсамольцамі, з музыкаю вышлі з брамы з заводу і накіраваліся па вуліцы Стачак. На чале асобных калён ішлі камсамольцы, нясучы плякаты з надпісамі: „алкагалізм і сацыялізм ня ўжываюцца разам", „ніводнае капейкі на гарэлку", „патрабуем забароны продажу гарэлкі ў дні получак", „даёш савецкую пуцілаўскую чайную», «мы проці п'яных бацькоў», „лішнюю капейку ў касу ашчадкасьці" і г. д.

Пры факельным асьвятленьні адбыўся антыалкагольны мітынг. У сваіх прамовах прамоўцы заклікалі рабочых абвясьціць суровую вайну ворагу здароўя і дабрабыту рабочых—алкагалізму. Тут-жа праводзілася кампанія па ўцягненьні рабочых у антыалкагольныя ячэйкі. На мітынзе прысутнічала некалькі тысяч чалавек. Шмат рабочых выказала жаданьне запісацца ў сябры антыалкагольнага таварыства.

Дэманстрацыя зрабіла на рабочую масу вялічэзнае ўражаньне

Сэктанцкім абармотам ня месца ў прафсаюзах

МАСКВА. УЦСПС растлумачыў, што служыцелі культаў рэлігійных сэкт павінны быць выключаны з складу саюзаў.

Новы начальнік вайск.-саніт. управы РСЧА.

МАСКВА. Саюзны СНК назначыў начальнікам вайскова-санітарнае ўправы Рабоча-Сялянскае Чырвонае арміі—сябра калегіі НК аховы здароўя РСФСР тав. Баранава—і вызваліў ад выкананьня гэтых абавязкаў т. Салаўёва з прычыны хваробы.

Перамогі на фронце калектывізацыі вёскі.

САМАРА, 2-XI. У 45-ці кілёмэтрах ад Самары дзьве суседнія вёскі—Багунская і Праабражэнская, якія налічваюць 250 двароў з зямельнаю плошчаю ў 2.300 гэктараў, заснавалі 2 калектыўныя гаспадаркі пад назваю „Чарназемныя волаты № 1 і № 2". Рашаючым момантам у заснаваньні гаспадарак зьяўляецца трактарная калёна абласнога сельсаюзу, кінутая ў райён гэтых вёсак. Кулакі вельмі супярэчылі проці заснаваньня калектыўных гаспадарак. Кулакам абвешчан грамадзкі байкот; яны атрымалі надзелы на самым канцы далёка ад кліну калектыўнае гаспадаркі. Гаспадаркі дамовіліся з абласным сельсаюзам аб поўнай гадавой апрацоўцы сваёй зямлі трактарнай калёнай і перайшлі на 12-цёпольны севазварот. У 5-цігадовым пляне ўведзен пункт аб перадачы ў грамадзкае карыстаньне жывёлы і пабудове школы. «Волат № 1» набыў млын, абсталяваў маслабойку і будуе грамадзкі магазын; „Волат № 2» узараў 700 гектараў.

Шкоднікі начале савецкае гаспадаркі.

ЦЬВЕР. Выязная сэсыя цьвярскога суду ў Вышнім Валачку скончыла разгляд справы на абвінавачаньні ў шкодніцкай дзейнасьці кіраўнікоў вялікае савецкае гаспадаркі Пуціна, Казлоўскае волаські, Вышневалоцкага пасту. Адказныя кіраўнікі гаспадаркі—ранейшы загадчык Пагрэбняк, старшыня трэсту Бананаў, намесьнік заг. Валжэніч і галоўны агранам трэсту Панфілаў,—падпаўшы пад кулацкі ўплыў, знарок руйнавалі гаспадарку, псавалі прадукты, прадавалі за бясцэнак патрэбныя гаспадарцы сельска-гаспадарчыя машыны.

Суд пасьля некалькіх дзён разгляду гэтае справы прызнаў эканамічную контрэвалюцыю адказных працаўнікоў гаспадаркі даведзенаю і засудзіў Пагрэбняка на 5 гадоў зьняволеньня, а іншых—на меншыя тэрміны Батракі і беднае сялянства здаволены прысудам.

Чыгунка Нова-Беліца--Чарнігаў.

КІЕЎ. 1-11. Сёньня адбылося афіцыйнае адчыненьне новае чыгуначнае каляіны Нова-Беліцы—Чарнігаў.

ЗАМАХ НА ПОЛЬСКАГА КОНСУЛА Ў ПРАЗЕ.

ВАРШАВА, 1-XI. Польскі друк паведамляе, што ў Празе ўчынен замах на польскага консула Любачэўскага. У памяшканьне консульства зьявіўся украінскі эмігрант Пасюк і затрабаваў спатканьня з Любачэўскім. Яму ў гэтым адмовілі. Аднак, Пасюк спаткаў Любачэўскага ў карыдоры, куды той выпадкова вышаў. Пасюк стрэліў у Любачэўскага, але прамахнуўся і быў затрыманы.

У арыштаванага знойдзен нумар нелегальнае газэты «Сурма» — орган украінскае эміграцкае вайсковае арганізацыі. У гэтым нумары агалошан ліст да польскага ўраду з перасьцярогаю, што арганізацыя будзе памшчацца за прысуды сьмерці сябром арганізацыі і між іншым, за прысуд львоўскага суду украінцам, абвінавачаным у наскоку на паштовую кантору

У апошні час.

Крывавыя падзеі ў Львове.

Схваткі украінскіх нацыяналістаў з польскай паліцыяй і польскімі студэнтамі.

ВАРШАВА, 2-XI. Учора, у зьвязку з 10-ай гадавінай польска-украінскай вайны ва Ўсходняй Галіцыі, Львоў стаў арэнай крывавых схватак між польскімі нацыяналістамі і паліцыяй, з аднаго боку, і украінскім насельніцтвам—з другога.

У ноч на 1 лістапада невядомыя асобы ўзарвалі дынамітам помнік польскім абаронцам Львову на вайсковых могільніках. Двое паліцэйскіх спрабавалі затрымаць невядомых, але былі спатканы рэвальвэрнымі выстраламі. Адзін з паліцэйскіх цяжка ранен. Невядомыя ўцяклі.

У тую ж ноч быў скавэркан і абліт чорнай фарбай помнік абаронцам Львову ў двары Палітэхнікуму, а на будынку Львоўскага Унівэрсітэту і на помніку Люблінскай вуніі невядомыя асобы вывесілі украінскія нацыянальныя сьцягі. На працягу дню адбываліся схваткі між польскімі студэнтамі і пасобнымі украінцамі, якія разгульвалі па вуліцах з нацыянальнымі істужкамі ў пятліцах. Пад вечар, калі пасьля панихыды ў царкве ў памяць украінцаў, загінуўшых у вайне з палякамі, украінскія нацыяналісты спрабавалі наладзіць вулічную дэманстрацыю—проці іх былі высланы атрады пешай і конная паліцыі. Паліцыя страляла залпамі. Пасьля зацяжнай перастрэлкі конная паліцыя ўварвалася на царкоўны двор, куды адступіла частка дэманстрантаў, і разагнала іх халоднай зброяй. У схватцы ранена некалькі дзесяткаў чалавек. Пасьля гэтых падзей усе паліцэйскія сілы Львову і гарнізон былі прыведзены ў баявую гатоўнасьць.

У 7 гадзін вечара польскія студэнты арганізавалі масавую дэманстрацыю супроць украінцаў. Дэманстранты ўварваліся ва украінскі студэнцкі дом і разграмілі яго. Каля дому разыгралася сапраўдная бойка між украінцамі і польскімі студэнтамі і паліцыяй. У часе гэтай перастрэлкі ранена некалькі дзесяткаў чалавек. Затым польскія студэнты накіраваліся ў украінскі квартал і разграмілі шэраг украінскіх устаноў.

Па вестках „Пшэглёнд Вячорны", адна толькі хуткая дапамога падабрала на вуліцах 80 раненых. Львоўскі карэспандэнт гэтай газэты сьцьвярджае, што лік раненых у два разы большы. Зроблены масавыя арышты і вобыскі сярод украінцаў.

* * *

ВАРШАВА, 2-XI. Учарашнія схваткі ў Львове адзначыліся вялікай упартасьцю. Па вестках з украінскіх крыніц, польскія студэнты-грамілы, уварваўшыся ў памяшканьне рэдакцыі «Дило», выкінулі з вакна з другога паверху адну з супрацоўніц газэты. Яна адвезена ў больніцу з пераломамі ног і раздробленай рукой.

Схватка каля украінскага студэнцкага дому цягнулася досыць доўга. Дом быў абкружаны польскімі студэнтамі і паліцыяй, якая адкрыла рэгулярны агонь.

Па вестках „Экспрэс Поранны", украінскія студэнты адкрылі ў адказ моцную страляніну з вокан свайго дому.

З паведамленьняў гэтай газэты відаць, што паліцыя ўзялася за ўціхаміраньне грамія пасьля 3-хгадзіннага пагрому.

Па вестках вячэрніх газэт, паліцыя і гарнізон у Львове ўсё яшчэ знаходзяцца ў баявой гатоўнасьці. Па вуліцах Львову курсіруюць шматлікія пешыя і конныя патрулі. Становішча ў Львове напружанае. Антыпольскія дэманстрацыі адбыліся таксама ў некаторых правінцыяльных гарадох Усходняй Галіцыі, у якіх невядомымі былі зьнішчаны помнікі польскім салдатам, загінуўшым у бойках з украінцамі.

У ПАНСКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Пілсудзкі імкнецца задобрыць сойм.

ВАРШАВА, 1-XI. У палітычных колах напружана абмяркоўваюць, якую пазіцыю зойме цяпер урад у адносінах да сойму і сэнату. Цікава, што ў апошні час урадавы друк устрымліваецца ад звычайных нападак і пагроз па адрасе сойму. У колах апазіцыі думаюць, што ўрад імкнецца павешыць адносіны в соймам і стараць бачнасьць супрацоўніцтва з ім, каб перакласьці на сойм частку адказнасьці за пагоршаньне эканамічнага становішча ў Польшчы.

На адчыненьні сэсіі прысутнічалі ўсе сябры ўраду апроч Пілсудзкага і міністра грамадзкіх прац пэнэсэўца Марачэўскага. Міністр фінансаў Чаховіч выступіў з кароткаю і вельмі блядою дэкларацыяй, у якой абыходзіў усе коштныя пытаньні і абмежаваўся тлумачэньнямі да бюджэтных меркаваньняў. Потым выступіў старшыня парляманцкае фракцыі беспартыйнага блёку супрацоўніцтва з урадам, дэпутат Славэк, які прапанаваў, каб канстытуцыйная камісія сойму распачала перагляд канстытуцыі польскае дзяржавы. Славэк абгрунтоўваў сваю прапанову патрэбаю упарадкаваць узаемадачыненьні між выканаўчаю і законадаўчую ўладаю, а таксама патрэбаю пашырыць паўнамоцтвы і абхват кампэтэнцыі прэзыдэнта рэспублікі.

Фашызм чакае падтрыманьня ад ППС.

„ППС зьяўляецца БАР'ЕРАМ ПОЛЬСКАЕ НАЦЫІ ПРОЦІ КАМУНІЗМУ"

ВАРШАВА, 1-XI. Орган ЦК ППС „Робітнік" агаласіў прывітаньне Дашынскага (ППСавец, старшыня сойму) зьезду старое ПЛС у Сасновіцах. Дашынскі вельмі нядвусэнсна выступае ў абарону Яваро́ўскага і яго «ідэалёгіі». Са здаволеньнем адзначаючы, што на выбарах у сойм ППС атрымала паўтары мілёны галасоў, Дашынскі зазначае на патрэбу перагледзець палітыку партыі.

„Чым буйней робіцца партыя,—піша Дашынскі,—тым мацней станоўіцца яе ўплыў на лёс дзяржавы. А магутнасьць і незалежнасьць дзяржавы—галоўныя ўмовы для разьвіцьця польскага сацыялізму".

Потым Дашынскі раіць праводзіць „рэальную палітыку" і прапануе зьезду на штурхаць партыю на апазіцыйную тактыку. ППС, водлуг слоў Дашынскага, «павінна забясьпечыць волю сацыялістычнае думкі, бо ў іншым разе яна стане астрогам для душы".

Адначасна з лістом Дашынскага орган пілсудчыкаў „Глос Правды" агалашае артыкул Сьпічынскага, таксама прысьвечаны зьезду ППС. Сьпічынскі нездавольны палітыкаю ППС і зазначае, што з аднаго боку, яна мала лёяльна ў адносінах да дзяржавы, а з другога—ня ўмее з пасьпехам змагацца з камунізмам.

«Калі Камінтэрн рушыцца праз нашую тэрыторыю на заваёву Эўропы, дык Польшча прымушана будзе стаць барэрам Эўропы проці бальшавізму. ППС, хоча яна гэтага, ці не, зьяўляецца і павінна быць бар'ерам польскае нацыі проці камунізму"—піша Сьпічынскі.

Рэпрэсіі проці партыі Радзіча.

Вена. Водлуг паведамленьняў газэт, югаслаўскі ўрад, у адказ на ўзмоцненую дзейнасьць сялянска-дэмакратычнае кааліцыі пагражае ёй рэпрэсіямі на падставе закону аб абароне дзяржавы. У Загрэбе і Белградзе былі выпадкі канфіскацыі апазіцыйных газэт за нападкі на ўрад. Арыштаваны рэдактар апазіцыйнае газ. «Народны вал» (орган партыі Радзіча) Дэўчыч вызвален, але разам з тым распачата справа проці дэпутата Пэрнару, які прызнаў сябе аўтарам артыкулу гэтае газэты, якая назвала караля ўдзельнікам тэрарыстычнага акту у скупшчыне (парляманце).

Італьянскі шпіянаж у Францыі.

ПАРЫЖ. Агенцтва Гаваса паведамляе, што затрыманыя ў Ліёне Ваколі і Накаціні прызналіся ў шпіянажы на карысьць аднае чужаземнае дзяржавы. Вобыскі ў іх сьведчаць, што яны імкнуліся здабыць весткі аб марскіх пабудовах на Міжземным моры. У якасьці іхняга супольніка арыштаван італьянец Расэці, які займаўся прыватным сыскам. На кватэры ў яго знойдзена шмат карэспандэнцый.

НЯМЕЦКА-ЛІТОЎСКІ ГАНДЛЁВЫ ЎГАВОР.

КОЎНЯ. 31-X. Літоўскае тэлеграфнае агенцтва паведамляе, што ўчора ў Берліне падпісан літоўска-нямецкі гандлёвы ўгавор, консульская канвэнцыя і ўгавор аб юрыдычн. абыходзінах.

Увесь літоўскі друк пацьвярджае, што скончэньне зацяжных перамоў, спаткана грамадзкасьцю са здавальненьнем.

IX усебеларускі зьезд с.-г. і лясных рабочых

РОСТ САЮЗУ С.-Г. І ЛЯСНЫХ РАБОЧЫХ.

Склад саюзу.

У сваім дакладзе старшыня Ц. П. саюзу тав. **Вайтэнкаў** даў поўны малюнак дзейнасьці Цэнтральнага Праўленьня саюзу сельска-гаспадарчых і лясных рабочых. З гэтага дакладу відаць, што ў БССР знаходзіцца каля 190 тысяч чалавек, занятых па найму ў розных галінах сельскай гаспадаркі, але ў саюз уцянута толькі каля 45 тысяч чалавек, з іх 24,7 проц. складаюць батракі. З гэтага відаць, што задача па ахапленьню саюзным членствам выканана толькі часткова. У далейшым трэба ўсім саюзным органам узмацніць работу па ўцягненьню ў саюз сельска-гаспадарчага пралетарыяту, паставіўшы сабе задачу каб да 1930 г. саюз меў у сваіх шэрагах ня менш 50 проц. батрацтва і пастухоў.

Ніжэй паданыя лічбы даюць характарыстыку складу членаў саюзу: мужчын—38.403, жанчын—7266, падлеткаў да 18-ці год—5592, партыйцаў—2369, камсамольцаў—4112.

СТРУКТУРА НІЗАВЫХ ПРАФАРГАНІЗАЦЫЙ.

У працягу апошняга году было праведзена ўзбуйненьне райкомаў: замест 109 райкомаў зараз існуе толькі 49. Такое ўзбуйненьне дало саюзу зьбереженьня 103.138 руб. у год. Гэтыя грошы далкам зьвернуты на пашырэньне сеткі сельрабачкомаў і фінансавага ўзмацненьня іх. Увогуле, уся саюзная маса, якая аб'яднаецца ў саюз с-г. і лясных рабочых абслугоўваецца сеткай у 964 ячэек: упаўнаважаныя на вёсцы, камслужы, прафкомы мястачковыя камітэты і г. д.

ВЫЛУЧЭНЬНЕ ЧЛЕНАЎ САЮЗУ НА КІРУЮЧУЮ ПРАЦУ.

Асобнае месца ў працы саюзу складае вылучэньне членаў саюзу на кіруючую працу, За справаздачны перыяд усяго вылучана на гаспадарчую і саюзную працу 102 асобы. Апроч гэтага, распрацован цэлы шэраг мерапрыёмстваў дзеля ўзмацненьня работы па вылучэньню сельгаслесрабочых і інш. груп.; напрыклад, арганізаваны курсы для падрыхтоўкі дзесятнікаў для лесараспрацовак, батрацкія курсы, курсы лясьнічых і інш. Зараз намечана арганізацыя курсаў для падрыхтоўкі кіраўнікоў савгасаў.

ФІНАНСАВАЕ СТАНОВІШЧА САЮЗУ.

Каб судзіць аб працы саюзу, трэба спыніцца на яго грашовых сродках. Увесь бюджэт саюзу на 1928 год складае 577223 руб., з якіх членскія ўзносы складаюць каля 211 тысяч р. Гэты бюджэт разьмяркован на каштарысу наступным чынам: на патрэбы ЦП выкарыстоўваюцца 6,8 проц. агульнага бюджэту, акрадзяленьні—8,1 пр. райкомы—19,1 проц., нізавыя ячэйкі—22,5 проц., на культурныя патрэбы—33,3 проц. і інш.

ПРАЦА СЯРОД СПЭЦЫЯЛІСТАЎ.

Трэба спыніцца на працы сярод спэцыялістаў, якая займае наважнае месца ў саюзе. З асобных мерапрыёмстваў у гэтай галіне трэба аднесьці: удзел членаў ЦП і працаўнікоў ЦБ на акруговых канфэрэнцыях спэцыялістаў правядзеньне агульных сходаў сезоннікаў-спэцыялістаў, арганізацыя касы ўзаемадапамогі Менскай акругі, арганізацыя розных курсаў па падвышэньні кваліфікацыі, вытворчыя экскурсіі і інш. У далейшым трэба зьвярнуць увагу на ўцягненьне спэцыялістаў у масавую, прафсаюзную, грамадзкую і вытворчую работу, а таксама на больш поўнае абслугоўваньне сяцкый.

АБСЛУГОЎВАНЬНЕ САЮЗНАЙ МАСЫ.

Значная работа праведзена саюзам на ахапленьню батракоў і пастухоў працоўнымі ўмовамі. Калі ў 1926 г. было ахоплена працоўнымі ўмовамі 25 тысяч чалавек ці 27 проц. агульнага ліку (усяго налічваецца 97 тысяч), то ў 1928 г. ахоплена ўжо 35 тысяч батракоў (40 проц.) Заключэньне працоўных умоў у сёлетнім годзе праводзілася больш своечасова і плянава, таксама паляпшаюцца матар'яльныя ўмовы батрацтва. Праўда, у гэтай галіне ёсьць яшчэ слабыя вучасткі, на якія трэба зьвярнуць належную ўвагу. Сюды трэба аднесьці слабы ўдзел у справе заключэньня працоўных умоў ГВК і сельсаветаў, разьлікі ўстанаўліваюцца ў канцы тэрміну, нездавальняюча пастаўлена праверка выкананьня дагавораў і іншым сацыяльным страхаваньнем ахоплена 43,1 проц. батрацтва, з якім заключаны працоўныя ўмовы. Да гэтага трэба дадаць, што райупаўнаважаныя страхкас не зварачваюць належнай увагі гэтай рабоце.

Што-ж датычыцца калдагаворнай работы саюзу, то ў 1928 годзе ахоплена дагаворамі 88870 чал. У параўнаньні з 1927 г. ахопленых дагаворамі павялічылася на 17846 чал. Гэта тлумачыцца пашырэньнем у апошні год тарфяных і мэліярацыйных распрацовак. Зарплата і ўмовы працы наступныя: сельгасрабочы ў савгасах Белсельтрэсту атрымлівае ў сярэднім у месяц 32 р. 80 к. (у 1926 г.—26 р. 50 к.), рабочы на тэхнічных прадпрыёмствах—39 р., рабочыя па нагляду за скацінаю—25 руб. 25 к. Апроч гэтага, рабочыя савгасу забясьпечаны дарэмнымі кватэрамі, апаламі, а там, дзе ёсьць электрычныя станцыі — электрычным асьвятленьнем. Лясьнік атрымлівае ў м-ц 20 р., абсезчык—30 р. Апрача гэтага, лясныя работнікі забясьпечаны службовымі надзеламі. Зарплата амаль усіх катэгорый спэцыялістаў у 1927-28 г. павялічана.

БЕСПРАЦОЎЕ.

Трэба спыніцца на стане беспрацоўя ў саюзе с.-г. і лясных рабочых. На 1 ліпеня г. г. налічвалася 5050 беспрацоўных. Пераважнае месца займаюць батракі—2220 чал. (37 проц.), адзіночкі 1475 чал. (24 проц.) і служачыя—1148 чал. (19 проц.). Для зьнішчэньня беспрацоўя трэба арганізоўваць арцелі з беспрацоўных на лясных, тарфяных і мэліярацыйных работах, а гэтага можна дабіцца.

КУЛЬТАСЬВЕТНАЯ ПРАЦА.

У галіне культасьветнай працы саюз мае поўныя дасягненьні. Сёлета скончылі пункты ліквідацыі няпісьменнасьці толькі аднаго саюзу 1222 асобы. Аднак, трэба адзначыць, што тэмп ліквідацыі няпісьменнасьці ня досыць шпаркі.

Саюз мае розныя культасьветныя ўстановы: 24 клюбы, 401 чырвоны куток, 133 куткі батрака, 136 куткоў с.-г. і лясных рабочых. Апроч гэтага, ёсьць 412 стацыянарных бібліятэк, якія маюць 180000 экз. кніжак (да УШ зьезду ў бібліятэках было 140000 экз.).

Значная работа праведзена ў справе ўцягненьня батрацтва ў навучальныя ўстановы. Сёлета паслана батракоў: у рабфакі—76 асоб, тэхнікумы—19 у інш школы—31 асоба, усяго 126 асоб.

Выканана дырэктыва УШ зьезду аб выданьні батрацкай газэты. Пачынаючы з ліпеня, стала выходзіць беларуская масавая батрацкая газэта з тыражом у 8000 экз.

Недахопы ў саюзным жыцьці.

(Са спрэчак па дакладу тав. Вайтэнкава).

Па дакладу т. Вайтэнкава разьвярнуўся жвавы абмен думкамі. Прадстаўнікі савгаскіх рабочых скардзіліся на тое, што кіраўнікі савгасаў зусім ня лічацца з пастановамі вытворчых нарад. Часта калектыўныя дагаворы ня выконваюцца: зарплата выдаецца несвоечасова, напоўнае і задавальненьне спэцадзеньнем, заўважаецца слабы пераход на зьдзельшчыну.

Рабочы савгасу Бабруйскай акр. т. **Ліпавец** скардзіцца на тое, што кватэрнае пытаньне пастаўлена ў іх вельмі дрэнна. Савгас гаспадарча слабы, а Белсельтрэст не адпускае сродкаў на гэту мэту.

— Сярод батрацтва,—кажа т. **Курыловіч**,—слаба вядзецца праца па падрыхтоўцы да перавыбараў саветаў. Трэба, наогул, больш актыўна высоўваць батрацкі актыў на кіраўнічую працу. Да гэтай справы на мясцох адносяцца неяк пасыўна, недаверліва.

Тав. **Суслоў** лічыць, што слаба вывучана становішча лесарубаў і сплаўшчыкаў. Лесарубам даюць дрэнныя струманты, дзякуючы чаму вытворчасьць працы слабая.

— У нас, у Віцебскай акрузе,—кажа батрачка Марчэнка,—ёсьць такія сельсаветы, якія мала цікавяцца становішчам батракоў; яны нават ня ведаюць часта колькі на тэрыторыі сельсавету знаходзіцца батракоў.

— У нашым савгасе,—кажа батрачка Іванова, Магілеўскай акругі,—вытворчасьць працы палепшылася; савгас дапамагае ваколічнаму сялянству. У нас належна пастаўлена культпраца. 2 разы ў месяц выпускаем насьценную газэту.

На думку т. **Любецкага** (Слуцкі райён) сацыяльнае страхаваньне слаба пастаўлена таму, што ўпаўнаважаным страхкасы выдаюць на разьезды па 5 проц. у месяц.

— Трэба зьвярнуць увагу,—кажа прамоўца,—на слабыя прысуды за зьбойства батракоў. У нас быў выпадак, калі суд засудзіў наймацеля да 2-х тыдняў зьняволеньня, калі апошні выбіў свайму батраку два зубы. Трэба больш сурова судзіць наймацеляў.

Т. **Кудрэвіч** скардзіцца на часта няўважлівыя, а часам нават грубыя адносіны адміністрацыі да спэцыялістаў. Трэба палепшыць фінансавае і тэхнічнае абслугоўваньне сяцкый спэцыялістаў.

Прадстаўнік лясных рабочых т. Палавінка (Гомельшчына) адзначыў, што становішча лясных рабочых не паляпшаецца. Кватэры ў лясьнікоў дрэнныя, грошай на рамонт не даюць. Таксама не ўрэгулявана пытаньне аб удзеле лясной варты ў аплаце за лесараспрацоўкі. На гэтай глебе бываюць часта недарэчнасьці, калі лясьнічыя за гэту працу атрымліваюць 500—1000 рублёў, а лясьнікі—15—25 рублёў у год.

Стары батрак т. Карнейчык у сваім выступленьні адзначае, што т. Рыжоў быў ня праў, калі ў сваёй прамове упікаў батракам, што яны не зацікаўлены ў падняцьці вытворчасьці працы. Бяда ў тым,—кажа т. Карнейчык,—што кіраўнікі савгасаў ня хочуць радзіцца з рабочымі аб справах гаспадаркі, а ўсё гэта робяць моўчкі, у сваіх габінэтах.

Па Беларускай ССР.

(Ад нашых карэспандэнтаў).

Аршанскі партактыў верны ленінскаму ЦК.

Ворша, 2-XI. Учора адбыўся агульна-гарадзкі сход партактыву гораду Воршы, на якім быў пастаўлен даклад аб адозьве ЦК УсеКП і Маскоўскай арганізацыі і зьдачах партарганізацыі. Актыў у сваёй рэзалюцыі вітае завастрэньне барацьбы з правым ухілам у партыі.

Актыў аршанскай партарганізацыі рашуча заявіў, што акруговая партарганізацыя, як і раней у барацьбе з трацкізмам, так і зараз у барацьбе з праваю небясьпекаю, застаецца вернай ленінскаму ЦК. Мы будзем надалей трымаць цьвёрда курс на індустрыялізацыю краіны, калектывізацыю сельскай гаспадаркі, узмацняючы наступ на варожа капіталістычныя элементы гораду і вёскі.

Аршаншчына перад Кастрычнікавымі ўрачыстасьцямі.

Ворша, 2-XI. Да сьвяткаваньня 11 гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі ў Аршаншчыне мае быць адчынен шэраг культурна-асьветных устаноў. У Воршы адчыняюцца два клюбы: адзін будаўнікоў, а другі фізкультурнікаў пры Смалярскай сельска-гаспадарчай школе. 8 лістапада адбудзецца ўрачыстае адчыненьне сялянскага нядзельнага тэхнікуму. У тэхнікуме ў першую чаргу будуць прымацца батракі і дзеці батракоў.

У мястэчку Кручы, Круглянскага райёну адчыняецца сямігодка ў былой яўрэйскай сынагозе. Ініцыятыва па адчыненьню належыць самім сялянам яўрэям.

У вёсцы Буда таго-ж райёну адчыняецца вясковая школа ў былым папоўскім доме. Апроч гэтага, адбудзецца цэлы шэраг урачыстых адчыненьняў чырвоных куткоў, мастоў, пабудаваных за сродкі самаабкладаньня і с.-гаспадарчых гурткоў.

Змагаемся з „чырвоным пеўнем".

(Барысаўшчына):

122 населеныя пункты з насельніцтвам 28.394 чал. абслугоўваюцца 25 пажарнымі дружынамі.

У шэрагах дружын знаходзіцца 831 дружыньнік. Замацавана да дружын 105 коняй.

Маемасьць дружын складаецца з наступнага:

10 пажарных сараяў, 25 пажарных насосаў, друкалак з бочкамі—30 шт, багроў—86, лесьнік—12, тапароў—27 і шмат інш. драбязгаў, якой няма точнага вучоту.

У сучасны момант зроблен заказ на 11 двухколак драўляных.

Фінансавае становішча пажарнай справы досыць дрэннае.

Ня гледзячы на тое, што РВК адпушчана 592 руб. і па 7-мі с-сав. сабрана па самаабкладаньню 2160 руб. і ад АВК—673 руб., усё-ж трэба падкрэсьліць, што з боку с-савету ня ўсё зроблена наконт узмацненьня фондаў барацьбы з пажарамі.

Клябанаў.

Ліквідуем няпісьменнасьць.

Гомель, 2—XI. Саматужна-прамысловы саюз пачынае праводзіць культпрацу па абслугоўваньню членаў арцеляў, у першую чаргу працу па ліквідацыі няпісьменнасьці і малапісьменнасьці.

Зроблен дагавор з Акрпалітасьветы Гомелю і Мазырскім аддзяленьнем таварыства «Прэч няпісьменнасьць» аб арганізацыі школ па ліквідацыі няпісьменнасьці і г. д.

Апроч таго, намячаецца арганізаваць шэраг курсаў для павышэньня кваліфікацыі арцеляў.

НОВЫ ТЭАТР ДА XI ГАДАВІНЫ КАСТРЫЧНІКА.

Полацак, 1-XI. *У дні сьвяткаваньня кастрычнікавае рэвалюцыі ў м. Дрыса (былым горадзе) будзе адчынен тэатр разам з кіно, які ўмесьціць каля 500 чал.*

Сродкі для пабудовы гэтага тэатру былі адпушчаны, мясцовымі арганізацыямі

СУБОТНІК ДАПАМОГІ ШКОЛЕ.

ПОЛАЧЧЫНА, 1-IX. Вучні Талочынскай сямігодкі (Аршанская акруга) наладзілі суботнік дапамогі школе.

Працавала на суботніку 120 чалавек. Грузілі на станцыі дровы. Нагрузілі 8 вагонаў. Запрацавалі 90 рублёў, якія будуць скарыстаны на паляпшэньне школы.

НЯДЗЕЛЬНЫ УНІВЭРСЫТЭТ У ГОМЕЛІ.

У Гомелі на фабрыцы «Везувій» адчыніўся нядзельны унівэрсытэт, на якім рабочым чытаюць лекцыі вытворчага характару.

ПЧАЛЯРНЫЯ ТАВАРЫСТВЫ Ў КОЖНЫМ РАЙЁНЕ.

Магілеў, 2—XI. У Чачэвічах створана пчалярнае таварыства, шаснаццатае па ліку ў акрузе. Такім чынам пчаляры ўсіх райёнаў акругі маюць свае пчалярныя аб'яднаньні.

Афармляем падпіску.

Бабруйск, 2-XI. Акруговым грашовым аддзелам на 28-е кастрычніка афармлена падпіскі на 2-ю пазыку індустрыялізацыі на 950.000 руб.

Гэтая лічба складае 96 процантаў папярэдняй падпіскі і 148,5 проц. ад усяго заданьня, што было дадзена на акругу.

Паляпшаем абслугоўваньне насельніцтва.

Магілеўскі адміністрацыйны аддзел мае вельмі шырокае дачыненьне да насельніцтва. Тут кожны дзень зьвяртаюцца сотні людзей: у адрасны і пашпартны стол, Загс і па прэгару іншых пытаньняў, якія датычацца органаў міліцыі.

Пры невялікім штаце працаўнікоў, нізкай кваліфікацыі апошніх і аплаце адміністрацыйны апарат дасягнуў значнай рацыяналізацыі ў сваёй працы. Так напр. пашпарты, або рознага роду даведкі даюцца гр-нам тут зараз-жа праз 10 хвілін, калі дакументы ў належным парадку, або ў той-жа дзень, чаго ня было раней.

Таксама і па Загс'е раней бывалі часы, калі за дакумантам аб узросьце па надворнаму выгляду трэба было зьяўляцца ў камісію праз 7-10 дзён, а цяпер у той-жа самы і рэдка на другі дзень. Рэгістрацыя актаў грамадзянскага стану цяпер зьяўляецца значную як быццам на першы погляд «дробязь», аддзяліў для запісу шлюбаў асобны пакоік, абсталяваў яго накшталт чырвонага кутка, чым стварыў зусім іншыя абставіны навакол аднаго з новых дасягненьняў у жыцьці савецкіх грамадзян пасьля Кастрычніка—савецкага шлюбу.

Цяпер можна наглядаць, як сьціпла, але прыгожа абсталяваны гэты куток нашага апарату, дзе вольна сядзяць парамі маладыя сьведкі, чакаючы пакуль запішуцца іншыя. На стале кнігі, газэты, журналы. Ніхто ня чуе сваркі, не нервуецца. Гэткія абставіны трэба было-б стварыць і на вёсцы дзе яны пакуль-што ня зусім спрыяюць барацьбе за новы быт. Паказаная «дробязь» не каштуе шмат грошай, а па сутнасьці паказвае, як павінен быць прыстасован наш апарат для абслугоўваньня патрэб насельніцтва.

Магілеў. **В. А.**

Чаго мы чакаем ад нашага пісьменьніка?

(На літаратурным дыспуце).

Пытаньне аб набліжэньні пісьменьніка да чытача, а таксама азнаямленьне чытача з працаю пісьменьніка ў нашым літаратурным і грамадзкім жыцьці ў апошні час займае пачэснае месца.

І трэба лічыць, што наладжаны па ініцыятыве камсамольскіх ячэек Белдзяржвыдавецтва і рэдакцый газэт літаратурны дыспут, які адбыўся 1-га лістапада, быў своечасовым і зьявіўся першым зьвяном моцнае жывое сувязі чытача і пісьменьніка.

Цікавасьць да гэтага вечару была вялікая. Аб гэтым гаворыць перапоўненая камсамольскаю і вучнёўскаю моладзьдзю заля і прысутнасьць як у прэзыдыуме, так і залі тэатру нашых пісьменьнікаў (Якуб Колас, Міхась Зарэцкі, Александровіч і іншыя).

На вечары паўстала некалькі пытаньняў.

Тав. **Сянкевіч** у сваім кароткім уступным слове дасканала высьветліў агульную задачу нашае літаратуры.

— Не «мастацтва для мастацтва» і нават не «пазнаньне жыцьця», а «сродак будаўніцтва нашага жыцьця» —«жыцьцё будаўніцтва».—Вось чым зьяўляецца наша літаратура.

Ёсьць дзьве плыні ў замежным і нават у нашым унутрысаюзным жыцьці. Гэта змагаюцца клясы. Змаганьне клясаў адлюстроўваецца ў індывідуме. Адбіць, вось гэтае змаганьне і сацыялістычнае будаўніцтва і зьяўляецца задачаю нашае літаратуры. Адбіць не агіткаю, а па-мастацку, з расчапленьнем новага чалавека.

Выступаўшыя згаджаліся з думкаю тав. Сянкевіча і высоўвалі свае, усё новыя і новыя пытаньні. Многія прамоўцы застанавіліся на пытаньні:—ці ёсьць у нас беларуская пралетарская літаратура? Цікавым было з гэтага боку выступленьне Максіма Гарэцкага.

— Пакуль у нас няма беларусізаванага пралетарыяту,—гаворыць Максім Гарэцкі,—дагэтуль ня можа ў нас быць ні беларускіх пралетарскіх пісьменьнікаў, ні беларускай пралетарскай літаратуры. Сучасныя нашы пісьменьнікі паходзяць з вёскі, ня ведаюць жыцьця пралетарыя, ды і пралетары наш ня вельмі зацікаўлен беларускай літаратурай, бо ня ведае беларускае мовы.

Шэраг прамоўцаў спыняліся на гэтай думцы і зазначалі, што справа стаіць ня зусім так, як яе высьвятляў Максім Гарэцкі. Попыт на беларускую кніжку ў рабочых бібліятэках значны. На фабрыках і заводах ужо зьнішчаецца спадчына русіфікатарскае палітыкі царскага ўраду.

Выступаўшыя ад імя чытачоў, зьвярталі ўвагу на другі бок справы.

— Трэба даць добрую беларускую кніжку, трэба даць раман, апавяданьне. Даволі вершаванага «трыньканьня» пра імкненьні да зор, да месяцу. Трэба з падняв'беснага парнасу зыйсьці на нашу зямлю, заглянуць у фабрыкі, заводы, камгасы, савгасы дзе будуецца сьвятлейшае ад зор жыцьцё.

Тав. Арабей у сваей прамове зазначыў, што ён не задаволен афарбоўкаю нашае вёскі новымі пісьменьнікамі. Так магчі калісьці пісаць «нашаніўцы».

З дасканала падрыхтаванаю прамоваю выступіў т. Гарадня. Ня меў ён толькі рацыі, калі гаварыў, што правая небясьпека ў літаратуры ўзмацняецца таму, што няма гегемоніі пралетарскай літаратуры.

Пралетарская літаратура без адміністрацыйнай гегемоніі заваюе і ўжо заваёўвае сабе пачэснае месца. Трэба толькі меней мудрагельстваў, якія так абараняў т. Гарадня.

«Сабачыя лісты» чытачом ня успрымаюцца. Але ня трэба перагібаць палкі. Чуў, мабыць, т. Гарадня як адказалі прысутныя на яго запытаньне:—«Ці будзе чытацца літаратура пра каханьне». З залі адказалі—«будзем!». Добра па гэтаму пытаньню сказаў т. Галавач:—Можна пісаць і пра каханьне, бо і камсамолец і батрак, і рабочы не пазбаўлены гэтага.

Уся справа ў тым, як пісаць,—адзначыў Міхась Зарэцкі. Трэба пісаць і пра мінулае змаганьне і пра сучаснае будаўніцтва.

Трэба даць толькі жывога чалавека з яго перажываньнямі, пачуцьцямі, перагібамі ў жыцьці. Даволі ўжо трафарэтных тыпаў на «пары чыстых» і «пары нячыстых»; у жыцьці такіх людзей няма. У адным больш станоўчых бакоў, у другім больш адмоўных. Вось гэткі пералом і трэба даць на фоне нашага сацыялістычнага будаўніцтва.

Уражаньне ад вечару застаецца добрае. Гэта першая цаглінка ў падваліну супольнай працы пісьменьніка і чытача.

Трэба болей практыкаваць таварыскія вечароў.

Янка Ліпн[illegible]

Апарат кас ашчаднасьці БССР.

Разьвіцьцё ашчаднай справы высоўвае пытаньне аб апараце кас ашчаднасьці і яго якасьці. Да апарату кас ашчаднасьці, які ў працэсе ўвасёй працы прыходзіць у цесную датычнасьць з шырокімі колямі насельніцтва, прад'яўляюцца вялікія запатрабаваньні як з боку яго кваліфікацыі, так з боку грамадзкай падрыхтоўкі.

За апошні год мы дасягнулі некаторага палепшаньня ў складзе працаўнікоў кас ашчаднасьці.

Хоць у нашых акруговых касах заўважаецца пэўны зьдзьвіг у бок лепшага падбору працаўнікоў, усё-ж трэба адзначыць, што ў гэтай галіне далёка ня ўсё зроблена.

Маючы на ўвазе, што акруговыя касы зьяўляюцца важнейшым зьвяном ашчаднага апарату, становіцца ясным, што якасьць яе працаўнікоў адыгрывае вельмі вялікае значэньне.

Пашы дырэктывы аб грамазьвіцьці ашчаднае справы вельмі часта ня выконваюцца альбо слаба выкончаваюцца, таму што кіруючы склад акруговых кас ня мае належнае падрыхтоўкі.

Тэхнічны склад нашых акруговых кас таксама не на вышыні. У некаторых касах дапушчаюцца памылкі; маюць месца няўважлівыя адносіны да кліентуры. У далейшым гэта павінна быць, бязумоўна, зьнішчана. На падбор людзей у акруговых касах трэба зьвярнуць дакладную увагу.

Толькі пры наяўнасьці ашчаднага апарату акруговыя касы змогуць стаць сапраўднымі арганізатарамі ашчаднай справы ў акрузе. На гэту акалічнасьць павінны зьвярнуць увагу акруговыя партыйныя і савецкія органы.

Далей у нас дрэнна абстаўлены са складам працаўнікоў у аддзяленьнях акруговых кантор сувязі, якія на кваліфікацыі сваёй мала падыходзяць да гэтай працы. Мы ўжо прынялі прав Беларускую Акругу Сувязі крокі да зьняцьця з працы ў некаторых акругах шэрагу працаўнікоў, якія няўважліва адносіліся да сваёй працы.

Неабходна акруговым канторам зьвярнуць на гэта пытаньне ўвагу і вылучыць для гэтай працы выключна падрыхтаваных працаўнікоў, маючых грамадзкія навыкі.

Саюз нарэшце павінен зацікавіцца гэтым пытаньнем і прыняць з свайго боку належныя меры.

Найбольш слабым месцам у нашым апараце зьяўляецца склад працаўнікоў прыпісных паштовых кас. Гэтыя касы, знаходзячыся ў райёнах і абслугоўваючы сялянства, маюць важнейшае значэньне ў нашай працы на вёсцы. Пажаль, мы ў гэтых касах маем мала адпаведных працаўнікоў. Большасьць з іх непрыстасавана да гэтай працы.

У далейшым неабходна пераглядзець склад нізавых паштовых кас і палепшыць яго. Мясцовыя органы павінны прыняць у гэтым самы актыўны ўдзел.

Падагульваючы становішча нашага апарату, трэба сьцьвердзіць, што ў гэтай галіне неабходны неадкладныя меры.

Той курс на дэцэнтралізацыю працы, які мы ў 1928-29 г. будзем праводзіць, можна ажыцьцявіць толькі пры наяўнасьці належнага апарату.

А таму неабходна зараз-жа забясьпечыць акруговыя цэнтральныя касы належным кіруючым складам—аб гэтым павінны паклапаціцца акруговыя партыйныя і савецкія органы.

Далей неабходна неадкладна пераглядзець склад тэхнічных працаўнікоў акруговых кас і палепшыць яго, каб ня было такога становішча, што з прычыны слабай кваліфікацыі апарату тэхнічная праца адстае і перашкаджае разьвіцьцю апэрацый.

Акруговыя канторы сувязі павінны зараз-жа паставіць у аддзяленьнях цэнтральных кас адпаведных працаўнікоў і прыняць усе меры да палепшаньня складу нізавых паштовых кас.

Зразумела, што падбор людзей можа быць зроблен толькі пры актыўнай дапамозе мясцовых органаў і савецкай грамадзкасьці.

Падольскі.

Col. Бел. 3 XI 1928. с 2

МІХАСЬ ЗАРЭЦКІ.

ЧЫМ ПАГРАЖАЕ НАМ БЕЛДЗЯРЖКІНО*).

(Да крытыкі тэматычнага пляну)

Я загадзя ведаю, што скажа Белдзяржкіно, каб растлумачыць гэта сваё захапленьне расейскай (ня першага гатунку) літаратурай. Яно скажа, што ў беднай беларускай літаратуры няма такіх твораў, якія-бы адпавядалі пастаўленай тэме. І трэба сказаць, што гэта магчыма. Але які вывад павінны мы з гэтага зрабіць? Ці маем мы права бяз доўгага клопату зараз-жа кінуцца да суседзяў і браць у іх усё, што трапіцца пад руку, абы яно адпавядала тэме?

Ня маем мы гэтага права. Мы павінны перш-на-перш падумаць пра самую тэму. Можа таму і не знаходзім матар'ялу ў нашай літаратуры, што мы ўзялі тэму ў такім разрэзе, у такім пляне, які не характэрны для нашых беларускіх умоў, які мы мэханічна перанесьлі з чужога поля, дзе ён, бязумоўна, меў апраўданасьць і актуальнасьць. Я помню, як па нашых клюбах разьбіралася і дыскусавалася паганая літаратурна слабая і неактуальная для нас кніжка Малашкіна «Луна с правой стороны» толькі таму, што на яе была мода ў Маскве.

Трэба больш увагі і давер'я да нашае ўласнае літаратуры. Трэба ня толькі выкарыстоўваць яе, як матар'ял, а трэба таксама вывучаць па ёй наша жыцьцё, браць з яе сапраўды жывыя рэальныя праблемы і тэмы. Трэба ведаць тое, што ні адна сапраўды актуальная балючая зьява жыцьця ня пройдзе без таго, ці іншага адбітку ў літаратуры. І яшчэ трэба ведаць тое, што наша беларуская літаратура ў гэтым сэнсе мае дзьве важныя асаблівасьці: 1) яна зьяўляецца адзінай нацыянальна-самабытнай формай мастацтва (іншых форм мастацтва ў нас пакуль што няма, апрача твораў народных і 2) што яна больш вытрымана ў ідэалёгічным сэнсе, чымся нашы суседнія літаратары: у нас няма ні Эрэнбургаў, ні Пільнякаў, ні Булгакавых—наша літаратура ў большасьці рэвалюцыйна-сялянская і пралетарская.

Пройдзем цяпер да другой часткі сацыяльна-бытавых тэм, што будуць будавацца на матар'яле вёскі. Тут справа яшчэ больш безнадзейная—непрадуманасьць і павярхоўнасьць, з якой сфармуляваны «вясковыя» тэмы, яскрава паказвае, што тэму, хто складаў гэты плян, вёска вядома прыблізна так, як мне скажам, нарыскі Манмартра. Вось для прыкладу адна тэма:

«Бабская атака». Вёска ў руках кулака. Спроба беднаты знайсьці для сябе выхад у калектыўнай гаспадарцы, дзякуючы націску кулака, не ўдаецца. За справу ўзяліся бабы, і іх атакаю вораг быў пераможан».

І гэта ня жарт, гэта ўсур'ёз. Якая наіўнасьць! Які «карамельны» погляд на вёску, на яе быт, на барацьбу! Якая злачынная павярхоўнасьць!

З рэшты вясковых тэм большасьць фактычна ня тэмы, а тыя галіны культурнае працы, пра якія чулі працаўнікі Белдзяржкіно і якія ўстаўлены «для широты обхвата». Лясная гаспадарка, калектывізацыя вёскі, антырэлігійная прапаганда, як цікавыя і больш-менш акрэсьленыя тэмы. Трэба адзначыць «Карчму», паводле паэмы Міх. Чарота і «Цярністы Шлях», дзе будзе выяўляцца, як пішуць Белдзяржкінаўскія грамацеі, «самавіта фарбавае жыцьцё палескага сялянства.» Магутныя жорсткія карціны нашага Палесься даўно просяцца на экран. Шкода толькі, што для гэтае карціны намечан такі прымітыўны сэнтымэнтальны сюжэт: «Цярністы шлях маладой настаўніцы-грамадзкай працаўніцы, да якой чэпяцца з прыкрымі любоўнымі дамаганьнямі». Да рэчы сказаўшы, чаму-б не скарыстаць для гэтае мэты аповесьць Якуба Коласа «У Палескай Глушы». Хоць ня сучасная, але затое сталая і мастацкі-каштоўная рэч.

Другі разьдзел тэматычнага пляну—«Агульна-палітычныя тэмы». Бухгальтар, які рабіў номэнклятуру пляну, гэты разьдзел, мусіць, уставіў проста па памылцы. Ня кажучы ўжо пра агульную туманнасьць гэтага тэрміну, трэба зазначыць, што дзьве першыя паказаныя тут тэмы адносяцца: першая—да бытавога аддзелу, а другая—да гістарычнага, і толькі трэцяя—«Апошняя вайна» Іоганэс Бэхэра—не падыходзіць ні да якога разьдзелу, у тым ліку і да агульна-палітычнага. Гэта, як і сказана ў пляне,—навукова-палітычная фантастыка.

Усе тры тэмы, паказаныя ў другім разьдзеле пры добрай распрацоўцы іх могуць даць цікавыя фільмы, але па сваёй актуальнасьці павінны стаяць бязумоўна не на першым масцы.

Разьдзел трэці—гістарычныя і гістарычна-рэвалюцыйныя тэмы. Гэта тыя выпадковыя тэмы, на якія няма адпаведных падзагалоўкаў у дакладзе «аб нашых чарговых задачах», якія выплылі «у працэсе работы». Сярод іх ёсьць некалькі тэм цікавых („3-пад ярма", «Салавей»), але ёсьць і зусім непатрэбныя. На якое ліха, напрыклад, браць нам такую агульна-саюзную тэму, як «Канец блазна»? У пытаньні аб гістарычных фільмах, мне здаецца, трэба праводзіць такі прынцып: перш-на-перш браць моманты з гісторыі Беларусі і ў другую чаргу—тыя моманты з гісторыі іншых народаў, якія або зьяўляюцца асабліва выдатнымі сусьветнымі зьявамі, або маюць асабліва блізкае дачыненьне да Беларусі. Бязумоўна, той факт, што Павал І быў царом і над Беларусьсю яшчэ не гаворыць за тое, што ён—асабліва выдатная для нас зьява ў расейскай гісторыі. І як наіўна і недалужна гучыць гэтае штучнае прышпільваньне названае тэмы да ўмоў Беларусі. „Узмацненьне прыгону на Беларусі за Паўлам І"—так сказана ў тлумачэньні да гэтае тэмы. Нашто гэтая фальшываьсьць, нашто гэтая гульня ў жмуркі. Калі вы хочаце паказаць прыгон, дык для гэтага можна знайсьці тысячу больш прыдатных тэм, яна-ж і ёсьць ужо гэтая тэма—аповесьць Бядулі «Салавей». А калі вам проста хочацца паставіць карціну вядомага кіно-рэжысэра (можа з камэрцыйных разрахункаў, а некалі «Проститутка»), дык нашто гэта прышпільваньне?

Тое самае можна сказаць і пра некаторыя іншыя тэмы з гэтага разьдзелу.

Яшчэ некалькі слоў пра тэмы дзіцячых фільмаў, зьмешчаныя ў разьдзеле V тэматычнага пляну. І тут непрадуманасьць і тут павярхоўнасьць. Пачаць хоць-бы з таго, што сярод надта абмежаванага ліку гэтых карцін вызначаны дзьве карціны абсалютна аднакага зьместу («Кветкі жыцьця» і «Дзеці рэспублікі»). Што гэта недагляд дзеславода, ці памылка бухгальтара? Да рэчы, варта зазначыць, што і ў іншых разьдзелах ёсьць тое самае.

Напрыклад, у разьдзеле «Сацыяльна-бытавыя тэмы па матар'яле гораду», цэлых тры карціны фактычна адбіваюць адну тэму: жыцьцё і быт нашае моладзі («Палаючы мост», «Магнэс», «Перакладзіна») і гэта ў той час, калі ў нас бракуе і матар'яльных і мастацкіх сродкаў. Гэта ўжо проста злачынная нядбайнасьць і няхайнасьць.

Што да зьместу дзіцячых фільм, дык тут трэба адзначыць страшэнную пэдантычную вузкасьць. Хіба піянэры і бяспрытульныя—гэта ўсё, што мы павінны паказаць нашым дзецям? Хіба варта было на гэтыя тэмы вызначыць цэлых тры фільмы? А дзе інтэрнацыянальнае выхаваньне дзяцей? А дзе тая неабходны для нашага маладога пакаленьня рэвалюцыйна-гэраічны эпос? А дзе, нарэшце, сям'я, дзе той быт—нявідны няпрыкметны быт, ад якога ў большасьці залежыць увесь будучы лёс гэтых маладых кветак жыцьця.

Калі вы хочаце мучыць дарослых дзяцей сухімі параграфамі з палітграматы, дык пашкадуйце хоць дзяцей,—за вошта-ж яны будуць пакутаваць?...

Ёсьць яшчэ адзін разьдзел у пляне—гэта «Палітычна-асьветныя тэмы», але я спыняцца на іх ня буду—справа адпаведных органаў праверыць, наколькі адпавядаюць яны бліжэйшым задачам палітасьветнай працы. Тут Белдзяржкіно асабліва многа думаць ня прыдзецца, а таму яно, бязумоўна, будзе «на высоте положения».

Зробім вывады.

Першы і асноўны вывад такі:

НА ГАСПАДАРЧЫМ ФРОНЦЕ.

Забясьпечаньне насельніцтва прадуктамі.

(Даклад Наркамгандлю т. Адамайціса на пленуме Менскага гарсавету).

Няма ніякага крызісу.

1 лістапада на пленуме Менскага гарсавету выступіў з дакладам аб забясьпечаньні насельніцтва прадуктамі Наркамгандлю т. Адамайціс.

— У апошнія часы,—адзначыў тав. Адамайціс,—можна заўважыць цяжкасьці ў забясьпечаньні нашых гарадоў прадуктамі і рэчамі першае патрэбы. Каля каапэрацыйных крам можна бачыць чаргі, некаторыя прадукты даюць па норме. Гэта выклікае скаргі з боку працоўных мас. Цёмны элемэнт выкарыстоўвае гэтыя часовыя замінкі і імкнецца давесьці, што гэта ёсьць крызіс і г. д.

Ці ёсьць у сапраўднасьці гэта крызіс?

Калі ўзяць прадукцыю, якую выпрацавала наша прамысловасьць за апошні год, то мы ўбачым, што яна павялічылася на 23 проц. супроць мінулага году. Калі-ж адняць ад гэтай прадукцыі тыя тавары, якія выкарыстоўвае сама прамысловасьць, то мы ўбачым, што на рынак паступіла на 17 проц. тавараў больш, чым у леташнім годзе. Мы маем значныя дасягненьні ў галіне экспарту і імпарту. У нас палепшылася становішча сельскай гаспадаркі. Лік рабочых у нашай прамысловасьці з кожным годам павялічваецца: у 1926-27 г. было 52900 рабочых, у 1927-28 г.—56300 рабочых, у 1928-29 г. мае быць 62700 рабочых.

З гэтага можна бачыць, што ўсе тыя цёмныя чуткі, што нібыта краіна перажывае крызіс, ня маюць пад сабой ніякага грунту.

Адкуль-жа, аднак, вынікаюць гэтыя цяжкасьці? Галоўная прычына захавана тут у тым, што за апошнія гады мы вельмі вырасьлі, палепшылася матар'яльнае становішча ўсіх колаў насельніцтва, павысілася пакупная магчымасьць.

Што наша думка правільна абгрунтавана, можна давесьці наступнымі фактамі. У працягу 3 летніх месяцаў 1926-27 г. у БССР было прадана 270 вагонаў цукру. За гэтыя-ж месяцы ў 1927-28 г. было прадана 400 вагонаў цукру, г. зн. на 125 вагонаў больш, чым у мінулым годзе. У Менску было прадана ў працягу 3 летніх месяцаў у 1926-27 г. 48,5 вагонаў цукру, сёлета—69 вагонаў.

Аб чым сьведчаць гэтыя факты?

Яны сьведчаць аб тым, што дзякуючы палепшанаму матар'яльнага становішчу, насельніцтва павялічыўся попыт на цукар.

Тое самае можна сказаць пра мануфактуру. У 1923—24 г. ва ўсім СССР было выпрацавана 288.000.000 мэтраў, у 1927—28 г.—2.525.000.000 мэтраў. Гэты скачок сьведчыць аб тым, наколькі ў нас павялічылася вытворчасьць мануфактуры.

Чаму не хапае хлеба.

Цяпер спынімся на хлебе. У першыя гады рэвалюцыі БССР ня толькі не завозіла хлеба, але харчавалася сваімі нават была магчымасьць вывозіць пэўныя партыі хлеба за межы рэспублікі. Зараз-жа мы бачым, што кожны год завозіцца ў БССР ад 15 да 20 мільёнаў пуд. хлеба-фуражу. Гэта тлумачыцца тым, што насельніцтва пачало лепш харчавацца і ня хоча прадаваць хлеб. Даўней яно было прымушана прадаваць хлеб, бо ня было іншых крыніц зыску, зараз-жа сялянства шмат заробляе ад лесарасьпрадовак, мэліярацыйных работ, ад абозу іншых с.-г. прадуктаў.

Другога боку трэба адзначыць, што гарнасьць хлеба скарацілася амаль на 50 проц. Асноўная прычына заключаецца тут у тым, што значна павялічылася расьцярушанасьць сялянскіх гаспадарак. Па скарачэньне тавернасьці хлеба таксама ўплывае нізкая ўраджайнасьць і інш. прычыны.

Цяжкасьці на хлебным рынку зараз тлумачацца тым, што Украіна, адкуль мы атрымлівалі значную частку хлеба, сёлета перажыла недарод. Праўда, у Сібіры сёлета добры ўраджай, але там сустракаюцца вялікія перашкоды з падвозам з прычыны дрэнных дарог і далёкай адлегласьці гаспадарак ад чыгуначнай калёіны. Вось чаму нам трэба быць больш ашчаднымі з хлебам.

Якія прадукты нам патрэбны?

ЗАДАЧЫ Г[illegible] нам патрабуецца круп і фуражу [illegible] мяркуем за[illegible] 12 м. пудоў, [illegible] венг. т. Куйбы[illegible] Рэшта 3 м. пуд. хлеба, круп і фуражу мы зможам атрымаць, калі ў Сібіры будуць добра праходзіць хлебазагатоўкі. Для забясьпячэньня запасаў хлеба наш урад пастанавіў павялічыць рэзервы хлеба ад 1-га да 1,5 мільёнаў пуд.

Што-ж датычыцца круп, то да апошняга часу іх ня было, зараз-жа пачалі прабываць партыі круп. З прычыны таго, што сёлета паўдалы ўраджай грэчкі, нам прыдзецца рабіць крупу з ячменю і аўсу, культуры якіх сёлета далі добры ўраджай.

Што-ж датычыцца тлушчаў, то зараз адчуваецца недахоп у гэтых прадуктах. Гэта тлумачыцца тым, што з прычыны цяжкасьцей на хлебным рынку пачалі менш адкармліваць свіней, а якія кормяцца, то дрэнна. Зараз мяркуецца арганізаваць рэзервовы фонд у 40 тысяч пуд. сала.

У галіне забясьпячэньня маслам можна казіраць тое-ж самае.

Наша каапэрацыя зрабіла вялікую памылку, калі яна не закупіла некалькі вагонаў масла, якое ў свой час ёй запрапанавалі.

Алей хутка прыбудзе ў Менск і будзем мець столькі, колькі яго было летась. Селядцы таксама прыбываюць у хуткім часе. Мяса ў нас не бракуе; бяда толькі ў тым, што мала кран у Менску і людзям прыходзіцца стаяць у чаргох. МЦРК павінен ужыць захады, каб пашырыць сетку мясных крам.

У адносінах мануфактуры і скур'я пакуль што ня будзе палепшэньня, але затое мы маем значныя запасы гатовага адзеньня і абутку. Трэба толькі арганізаваць майстэрні для папраўкі абутку.

Гавны ў нас хапае, але толькі трэба пашырыць сетку крам.

НА НОВЫМ ШЛЯХУ.

Капыль перараджаецца.

Капыль разьлёгся на гарыстай мясцовасьці. Самы цэнтр яго стаіць на самай высокай мясьціне. Адсюль ва ўсе бакі, як рэчкі з водазбору, расходзяцца вуліцы. А вуліц з завулкамі ў Капылі шмат. Шмат іх праходзіць па нізінах, каля невялічкай рэчкі.

Вясною і восенью тут бяда. Вуліцы ператвараюцца ў непраходныя балоты.

Мука была сялянскія коням. Не маглі пацягнуць парожняга возу. Урэзваліся калёіны па самыя калодкі.

Але ў гэтым годзе за сродкі ад самаабкладаньня пачалі брукаваць вуліцы.

З вялікай радасьцю глядзяць сяляне як замест зацягнутых гразёю выбоін, растуць чыстыя брукаваныя вуліцы. І там, дзе яшчэ ўчора нельга было прайсьці, праехаць,—сёньня блішчаць роўныя пакатыя вуліцы. Капыль перараджаецца!..

* * *

У цэнтры мястэчка—вялікі цагельны будынак. Гэта—пажарнае дэпо—дабраахвотная пажарная дружына мае сваю даўнасьць. Яна скора будзе сьвяткаваць 41 год свайго існаваньня. Пры савецкай уладзе пажарная дружына набыла шмат новых машын, багроў, павозак і бочак. Ёсьць свой клюб.

Каля пажарнай—артэзыянская студня. Яе зрабілі ў 1927 годзе. Білі камяністы грунт, сьвідравалі глыбы зямлі, цяжка было дастаць вады, але дасталі. 70 сажняў жалезных труб было ўвагнана ў зямлю. Цяпер ужо ёсьць вада. Сялянам, прыехаўшым на кірмаш, ня трэба бегаць па хатах і прасіць вады. У помпе яе—колькі хочаш.

— За Мікалаем гэтую студню пачыналі біць тры разы і тры разы пакідалі працу,—не маглі прабіць каменныя пласты зямлі. І толькі савецкая ўлада гэта змагла зрабіць,—так кажуць цяпер сяляне.

* * *

Ідзеце па мястэчку далей. Беленькі, каменны будынак. Гэта—«Універсальны магазын Капыльскага спажывецкага таварыства». У магазыне ёсьць аддзелы: бакалейны, піўны, мануфактурны, скураны, гатовай вопраткі і кніжны. Гатовае адзеньне дае Капыльскі калектыў краўцоў.

У гэтым будынку калісь гандлявала каля 10 прыватнікаў. Цяпер іх няма. Каапэрацыя заглушыла прыватны гандаль.

Ёсьць крамы: сальная, крэдытнае таварыства пажарнікаў, інвалідаў вайны, крама сельска-гаспадарчых машын, крамы па куплі рознага збожжа і інш.

На рагу Пясьвіскай вуліцы і Базарнага пляцу адбудоўваецца вялікая аптэка.

Вы на «брахалаўцы». Гэта самае людное месца ў Капылі. Раптам каля нардому ўспыхвае электрычная лямпачка.

Сёньня нядзеля. Сёньня кіно. Апошнае бывае кожны тыдзень. Калі ў старыя часы сялене ня ведалі, што такое электрычнасьць, дык пры савецкай уладзе яны бачаць нават кіно.

* * *

У гэтым годзе, па ініцыятыве новых тэхнікаў т. т. Хатэнкі і К. Гурыновіча арганізавалася агнятрывалае таварыства. Ужо зроблена: цэмантнае чарапіцы 21 тысяча, бэтонных кругоў для калодзежа 215 і комінаў на печы—80 штук.

У былыя часы крыць хаты чарапіцаю маглі толькі паны, а цяпер і мы дамагліся гэтага—кажуць сяляне. Праўда, першая чарапіца прамакала. Была дрэнная абліпоўка. Але з кожным днём яна паляпшаецца.

Гэтым летам пачалася пабудова камбінату, які складаецца з электрычнае станцыі, млыну і воўначоскі. Ужо зроблены першы каменны паверх яе і 2 драўляныя.

У сучасны момант ставяцца слупы, па якіх электраток будзе праводзіцца ў сялянскія хаты.

Скора і ў хатах капылян загарыцца лямпачка Ільліча.

* * *

Гэтаю вясною пачалося земляўпарадкаваньне Капыля. Зямля капылян знаходзіцца за 4-5 вёрст. Загэтым была дрэнная яе апрацоўка, але калі пройдзе земляўпарадкаваньне мястэчка, гэтыя недахопы будуць зьнішчаны.

Ужо закончаны абход акруговай мястачковай мяжы, вымер дрэннай зямлі—няўдоб'я, сенажаці, праводзіцца разьбіўка пляцоў.

Капыль земляўпарадкоўваецца, брукуецца, электрыфікуецца. Капыль вучыцца, пачынае жыць па-новаму, культурнаму, савецкаму.

Капыль перараджаецца.

Пятрусь Шкадарэвіч.

Капыль, Меншчына.

Пытаньні ўраджайнасьці і савгасы.

Зараз мы знаходзімся ва ўмовах даволі шпаркага росту народнае гаспадаркі наогул, а ў сельскай гаспазарцы гэты рост выяўляецца ў павялічэньні пасеўнае плошчы, росце жывёлаводзтва, у пераходзе масы селянскіх гаспадарак да шматпольля і г. д. Усё гэта гаворыць за тое, што наша сельская гаспадарка грунтоўна перабудоўваецца. Але калі паглядзець на сярэднія ўраджаі, якія сялянства атрымоўвае ад сваёй гаспадаркі, дык гэтая ўраджайнасьць зусім нездавальняючая, бо яна нават не дасягае тэй ураджайнасьці, якая была да ваеннага часу.

Аб чым гэта сьведчыць? Аб тым, што мы да гэтага часу мала зьвярталі ўвагі ня толькі на падвышэньне ўраджайнасьці, якое з году у год хістаецца, у залежнасьці ад мэтэорологічных умоў, але, дасягнуўшы некаторага падвышэньня, не замацавалі яе належнымі мерапрыёмствамі. Каб паставіць справу падвышэньня ўраджайнасьці належным чынам, трэба прыцягнуць да гэтага пытаньня ўсе дзяржаўныя і грамадзкія арганізацыі, спэцыялістаў сельскае гаспадаркі, нашу моладзь, рабочых, працуючых у сельскай гаспадарцы і само насельніцтва, бо толькі пасьля шырокага абгаварэньня агульнымі сілами можна будзе дэталёва вызначыць тыя мерапрыёмствы, якія трэба ўжыць для павялічэньня ўраджаю.

Адной з такіх арганізацый, якая павінна аддаць максимум увагі справе падвышэньня ўраджайнасьці, зьяўляюцца савецкія гаспадаркі. Якую-ж ролю яны павінны адыграць у гэтым даўно пастаўлым пытаньні? Зразумела пераважную ролю, бо, першае, яны зьяўляюцца дзяржаўнымі ўстановамі, аснаўная мэта якіх, як прадпрыёмстваў паступовага сацыялістычнага тыпу, ня толькі здабыць агрыкультурныя каштоўнасьці і сродкі вытворчасьці з дапамогай якіх толькі і можна падняць на належны тэхнічны ўзровень сялянскую гаспадарку, але яны павінны быць культурнымі асяродкамі, дказваючымі эканамічную перавагу буйнай гаспадараі над дробнай сялянскай.

Але гаварыць аб тым, што савгасы дасягнулі належнае ўраджайнэсьці, ня прыходзіцца, бо і гэтая ўраджайнасьць пры тых эканамічных і тэхнічных умовах, якія ёсьць у савгасах, усё-ж застаецца невялікай і каб стаць сапраўды культурнымі асяродкамі буйнага земляробства сярод масы дробных сялянскіх гаспадарак, неабходна савецкім гаспадаркам у першую чаргу ўсю сваю ўвагу зьвярнуць на пытаньне падвышэньня ўраджайнасьці, каб ужо цяпер падрыхтавацца да правядзеньня ў весну 1929 г. тых мерапрыёмстваў, якія спрыяюць гэтаму.

Першачарговымі пытаньнямі, якія павінны быць ужыты самімі савецкімі гаспадаркамі па нашай думцы, павінны быць: 1) зяблевая ворка на ўсе 100 проц., 2) свачасовая вывазка гною і яго заворка, 3) лепшая і свачасовая апрацоўка глебы, 4) свачасовы пасеў добрай якасьці насеньнем з шырокім ужываньнем радковых сяўнікоў, 5) больш шырокае ўжываньне лубіну на ўгнаеньне і штучных угнаеньняў, 6) ужываньне торпу на ўгнаеньне, 7) як мага большае выкарыстоўваньне ў самой гаспадарцы адкідаў бульбаапрацовачных прадпрыёмстваў на адкорм жывёлы, 8) больш шпаркае палепшаньне натуральных сенажаняў, якія дадуць магчымасьць утрымліваць і большы лік жывёлы і 9) узмацненьне барацьбы са шкоднікамі.

Пытаньні другога парадку, якія залежаць ад савецкае гаспадаркі, па абслугоўваньню насельніцтва будуць такія: а) пашырэньне вытворчасьці чыстагатуняковага і палепшанага насеньня дзеля распаўсюджваньня сярод насельніцтва, б) арганізацыя новых і пашырэньне існуючых зернаачыстных абозаў, каб ваколічнае насельніцтва засявала толькі ачышчаным насеньнем, в) арганізацыя новых і пашырэньне існуючых пракатных пунктаў сельска-гаспадарчых машын, галоўным чынам на апрацоўцы глебы і пасеву, г) вядзеньне працы сярод насельніцтва аб хутчэйшым пераходзе на шматпольле, д) палепшаньне наогул агранамічнага абслугоўваньня насельніцтва з боку савгасаў шляхам лекцый, гутарак, экскурсій і паказальных прыёмаў вядзеньня культурнае гаспадаркі і е) больш цесная сувязь савгасаў з калектыўнымі гаспадаркамі.

Усе закранутыя пытаньні кіраўнікам савецкіх гаспадарак трэба абгаварыць на вытворчых нарадах з прыцягненьнем на іх шырокіх колаў рабочых і моладзі, бо падвышэньне ўраджайнасьці—першачарговая задача ўсіх працуючых у савецкіх гаспадарках. **Жук.**

Твар сёнешняе вёскі.

(З падарожжа па Любіцкаму с.-с., Горацкага р-ну, Аршаншчына).

«АЎТАДОР» ЕДЗЕ.

Над палямі сівыя туманы і чырвань апаўшых лістоў па над узьлесьсем, у палёх бурая кастрычнікавая жоўць травы і яскравая зеляніна азімых, у палёх гойсае вецер і туліцца пад салому ад дажджу вясковыя хаты, і асеньняе пануе ў палёх бездарожжа...

— Но-о, сіўка, цягні, кося, апошняе гора пераяжджаем... Хутка аўтадор прыедзе, масты пабудуе, но-о, вазьмі яшчэ разок.

Гэта дзядзькі вязуць на кірмаш бандарства. Скрыпяць высокія з яшчыкамі і бочкамі вазы, у мыле конікі і шлёпаюцца за вазамі па калені ў гразі сяляне. Лагчыны бязьлітасна заліты неўгаданымі асеньнімі дажджамі, раскуламешаны калёсамі і многа яшчэ прыдзецца папучыцца конікам да недалёкага мястэчка.

— Эх-ха-ха,—уздыхае барадаты дзядзька і сумна аглядваецца назад:— Гэта-ж распусьціўся народ пры савецкай уладзе. Вось у вайну за Дняпром былі немцы—хіба дапусьцілі-б яны да гэтага? Ня-е галубчыкі, яны-б вас прымусілі зрабіць гэблю, плаву-чы зрабілі-б... Хутчэй-бы ўжо прыяжджаў гэты аўтадор.

Ячэйкі аўтадору ў сельсавеце яшчэ няма, але слава аб ім па вёсках разышлася шырока, як аб нейкім асілку, які прыдзе, згоніць увесь народ і адразу пабудуе масты, наладзіць дарогі.

— Ціперака восень—кажуць сяляне,—рабіць нам амаль што няма чаго. Дык няхай-жа гэты аўтадор выганяе на дарогі ўсіх, ад малога да вялікага на тыдзень, на два тыдні, няхай, бо калі нашага брата ня прымусіць—нічога ня выйдзе: Іван будзе глядзець на Хведара, Хведар на Пятруся, а справа ні з месца. А так далей нельга, бо замучыла нас і конікаў нашых гэтае праклятае бездарожжа.

НА ПЕРАЛОМЕ.

У сельсавеце дзесяць вёсак і амаль-што ўсіх іх да апошняга часу карміў больш лес, чымся зямля. Узімку вазілі на лесапілкі бярэвні, вясной і восенью займаліся бандарствам. Былі грошы, быў і хлеб. Таму часта казалі сяляне:

— Ат, уродзіць збожжа—добра, ня ўродзіць—купім, аб чым бядаваць? Было-б толькі здароўе.

Але ціперака погляды гэтыя зьмяніліся. Скараціліся лесараспрацоўкі, патаньнела бандарства, бо занадта многа разьвялося бандароў, некалькі год падрад быў недарод. І неяк сам сабою выплыў на паверхню сялянскай сьвядомасьці новы лёзунг: тварам да зямлі. Таму за апошнія гады трэцяя частка вёсак правяла земляўпарадкаваньне, пашырыўся засеў канюшыны, сотнямі пудоў разыходзіцца штучнае ўгнаеньне.

КАНЮШЫНА ІДЗЕ Ў НАСТУП НА БЯСКОРМІЦУ.

Гэта ня голыя словы, ня выдумка, а вельмі прыемны факт. Канюшына ня толькі ідзе ў наступ на бяскормiцу, яна амаль-што ў большасьці вёсак перамагла яе. Калі ў 1923-24 годзе ў некаторых вёсках нашага сельсавету спрабавалі выкарыстаць на корм стрэхі, калі тады пуд сена дасягаў вясной да рубля, дык ціперака больш 50 к. цаны на пуд няма і страхі ніхто ўжо ня чапае.

Вось для прыкладу вёска Ходараўка. Яна яшчэ не земляўпарадкавана і пануе самая злосная перазпалосіца і трохпалёўка. Але ў кожным полі вы ўбачыце палосы з канюшынай. Звычайна вясной умаўляюцца, на якія палосы вазіць гной, каб усім потым разам засеяць канюшыну. Сёюць некаторыя па пуду, займаюць амаль-што па цэлай дзесяціне, але і дзесяць фунтаў, пасеяныя бедняком, даюць 100-150 п. добрага корму і выратоўваюць ад бяскормiцы.

Вёскі Аўсянка, Цімохаўка і Шэды земляўпарадкаваны і там цяжка знайсьці гаспадара, у якога ня было-б васеняя хоць невялікі кавалак зямлі гэтай «цудоўнай травой». Такім чынам пытаньне аб бяскормiцы вырашана самім жыцьцём.

Селькор Янка Галянкоў

БЯРЫЦЕ ПРЫКЛАД.

У 1926 годзе ў в. Палесьсе прайшло земляўпарадкаваньне, з якой выдзелілася 5 пасёлкаў і толькі адзін а іх пасёлак «Новая деревня» пахаваў трохполку і ўзяў шасьціпольны севазвароот і ўвадзе гаспадарку па ўказанню агранома. Ужо ў мінулым годзе на райённай выстаўцы пас. «Новая деревня» атрымаў 1-ю прэмію. У бягучым годзе таксама экспанаты пасёлка зьвярнулі на сябе ўвагу гледачоў і экспанаты пас. Палесьсе ўпрыгожвалі выстаўку, начаны пар'ятны школы КМ дасягалі 1,5 пуда. Школа КМ атрымала прэмію—сартыроўку, каштуючую 81 р., а пас. «Новая деревня»—лёнамялку.

Неабходна ўсім пасёлкам браць прыклад з памянёнага пасёлку і павучыцца ў яго.

Што можна адзначыць у гэтым пас. «Новая деревня». Пасеў жыта сартавога на зааранай канюшыне, па лубіну, па гнюю, па суперфасфату і па наўгноенай зямлі. Частка радавых пасеваў, частка ўручную і зараз сяляне выходзяць на палі і бачаць розны малюнак, які дае іх зьяўляецца вельмі навучальным, і не на словах, а жывой агітацыяй. На палёх пасёлку мелеца шмат насеньня лубіну, канюшыны і ў будучую весну пасёлак зможа даць пасяўнога матар'ялу: аўса «залаты дождж»—100 пуд. і ўвосень сартавога жыта—100 пуд.

Вось выніні 2-хгадовай працы. Сёлета пасёлак адведзіў поле ў 7 дзесяцін пад пасёлкавы сад. Мае на мэце вырыць возера і завесьці рыбу. Добра працуе таксама і машынная таварыства.

Новікаў.

Чэчэрск, Гомельскай акругі.

За мэтазгоднае выкарыстаньне крэдытаў.

У крэдытаваньні калгасаў дзяржаўнымі і каапэратыўнымі арганізацыямі прароблена вялікая праца.

Ці было ўсё ў парадку ў сэнсе крэдытаваньня калгасаў? Што ўзята ў аснову крэдытаваньня? Як скарыстоўваюцца крэдыты? Хто зьяўляецца адказным за рацыянальнае і мэтазгоднае выкарыстаньне крэдытаў?

Вывучэньнем, наколькі адпушчаныя крэдыты здавальняюць, наколькі яны рацыянальна выкарыстоўваюцца і даюць эканамічны эфэкт, ніхто не займаўся. З гэтай прычыны прыходзілася казіраць такія факты, калі 2-3-гадовыя крэдыты былі ўкладзены ў галіны гаспадаркі, якія не маглі сабе апраўдаць у працягу такога перыяду і ў выніку падалі ўсёй цяжкасьцю на гаспадарку. Часта бываюць такія факты, калі калгас атрымлівае крэдыт на закупку жывёлы і жывёлу ня купляюць, а дзеляць грошы паміж членамі, і кожны скарыстоўвае па свайму погляду. Скарыстаньне крэдытаў не па прызначэньню асабліва заўважваецца ў новых калгасах.

Выбарачнае абсьледваньне новых калгасаў Віцебскай акругі паказала, што большасьць калгасаў скарыстоўвалі крэдыты не па простаму прызначэньню. Зусім зразумела, што пры такім падыходзе да крэдытаваньня калгасаў мы далёка ня пойдзем, а толькі разложым калгасы і скампрамэтуем калектыўнае земляробства ў вачох сялянскай масы. Для выпраўленьня існуючых ненармальнасьцей мы павінны да крэдытаваньня ў далейшым падысьці зусім інакш. Нам неабходна знайсьці вінаватага. За мэтазгоднае хадайнічаньне і рацыянальнае скарыстаньне крэдыту па прызначэньню павінны ў аднолькавай ступені быць адказнымі аграпрацаўнік і кіраўнік калгасу складаючыя каштарыс крэдытаваньня, калгасасяцкія, якія дае сваё заключэньне і сельбанк, які адпускае крэдыт.

Пры складаньні крэдытнага каштарысу і вытворчага пляну павінен быць улічан напрамак гаспадаркі. Крэдытаваць калгасы належыць выключна па вытворчых пляновых. Крэдыты павінны накіроўвацца ў тыя галіны, якія адпавядаюць належнаму напрамку і якія могуць даць найбольш эканамічны эфэкт. Пры крэдытаваньні калгасаў павінна быць зьвернута асабліваа ўвага на іх размер. Крэдыты неабходна накіраваць у першую чаргу ў буйныя калгасы, якія здольны скарыстаць перавагу буйнай гаспадаркі і давесьці выгаднасьць калектыўнага земляробства. Размер крэдытаваньня калгасу павінен таксама знаходзіцца ў залежнасьці ад ступені абагуленьня ў ім працасаў вытворчасьці.

Вывучэньне эфэктыўнасьці крэдытаў павінна зьяўляцца неадкладнай задачай калгасных органаў. Толькі пры гэткім вырашэньні гэтага пытаньня ўласна стварыць пляванасьць у крэдытаваньні калгасаў.

Аграном Цынкоў.

Страхоўку выплацім у тэрмін.

Страхавыя налічэньні на сялянскія гаспадаркі па Рагачоўскаму раёну закончаны, налічэньні перапісаны на асобныя лісты кожнаму платніку, якія ўжо разасланы па сельсаветах.

У сельсаветах раздача лістоў страхоўкі пачалася. Сяляне вёскі В.—Крушынаўкі ўжо ўсе атрымалі лісты.

Прыкрыцца агульнае павышэньне страхавых плацяжоў на 25—30 проц., але гэта не выклікае нараканьняў з боку сялянства, бо як больш заплацім дык і больш атрымаем у выпадку якога няшчасьця.

Былі выпадкі ў вёсцы Фалевічы, што згарэла 6 двароў і калі атрымаў заможны гаспадар страхоўку, дык і хлева добрага за гэтыя грошы не пабудаваў.

Бедната ад аплаты будзе вызвалена, бо прадастаўлен фонд у 395 руб. на скідку. Наогул сяляне страхоўкай задаволены і кажуць, што выплацяць у тэрмін.

Я. Крушына.

Бабруйшчына.

Пэрспэктывы разьвіцьця мясцовай прамысловасьці на бліжэйшае пяцігодзьдзе.

Мясцовая прамысловасьць (акрвыканкомаў і райвыканкомаў) у мінулыя гады ня мела ўвязкі з рэспубліканскаю прамысловасьцю, прамысловай каапэрацыяй і працкалектывамі; пачынаючы з 1927-28 г. гэты недахоп пачынае паступова зжывацца.

За пяцігодзьдзе—1928-29—1932-33 г.г. намячаецца паступовае плянавае павялічэньне, пераважна за кошт новых прадпрыёмстваў, перадачы арэндаваных на гаспадарчы разрахунак і інш.

У масе сваёй прадпрыёмствы мясцовай прамысловасьці, па ўсіх яе зьвеньнях, зьяўляюцца дробнымі, і тэхнічны ўзровень іх яшчэ досыць нізначны. У канцы пяцігодзьдзя працас грунтоўнае рэканструкцыі прадпрыёмстваў па ўсіх зьвеньнях будзе амаль поўнасьцю закончан, і значна павялічыцца лік нанова пабудаваных заводаў, фабрык, тэхнічны ўзровень якіх будзе значна павышан.

Пяяўнасьць пераважаючага ліку дробных прадпрыёмстваў у мясцовай прамысловасьці БССР зьяўляецца яе галоўнай асаблівасьцю, якая адрозьнівае яе (за ўсе 5 год) ад тэй-жа прамысловасьці іншых рэспублік.

За пяцігодзьдзе 1928-29—1932-33 г. г. у арганізацыйных формах мясцовай прамысловасьці БССР мы будзем мець новы пэрыяд—калі мясцовая прамысловасьць становіцца рэзервам для папаўненьня рэспубліканскай прамысловасьці (за кошт прадпрыёмстваў АВК, працкалектываў і інш.), што якраз не адпавядае таму пэрыяду (1923 г.), калі рэспубліканская прамысловасьць выдзяляла частку сваіх прадпрыёмстваў для ўтварэньня мясцовай прамысловасьці.

Поруч з агульным ростам колькасьці прадпрыёмстваў расьце і колькасьць занятай у ёй рабочае сілы.

Агульны прырост рабочае сілы за пяцігодзьдзе на ўсіх зьвеньнях складае +161,4 проц., а па асобных зьвеньнях: акрвыканкомах і РВК +98,9 проц., Беларускаму Саматужнаму Прамысловаму Саюзу—240,9 проц., Белар. саюзу каапэр. інвалідаў +229,7 проц. і працкалектывах +91,3 проц.

Найбольшы прырост рабочае сілы за пяцігодзьдзе даюць наступныя галіны прамысловасьці: апрацоўка лёну, пянькі і воўны +540 проц., здабываньне і апрацоўка мінералаў +362,2 проц., тэкстыльная +357,6 проц., металёапрацоўваючая +220,8 проц., дрэваапрацоўваючая +132,7 проц., «пищевкусовая» +131,8 проц., абутковa-скураная +107,6 проц.

Гэткі высокі рост колькасьці рабочых і каапэраваных тлумачыцца, з аднаго боку, выключным разьвіцьцём лёгкай індустрыі ў мясцовай прамысловасьці БССР, якая выкарыстоўвае вялікую колькасьць рабочае сілы, з другога—нарагам мер па ўзмацненьню крэдытаваньня, падаткочымі льготамі, арганізацыяй дастаўкі сыматужнікам, інвалідам і працкалектывам неабходных матар'ялаў, у тым ліку імпартных, што спрыяе працасу каапэраваньня і ўцягваньня ў працоўныя працасы большай колькасьці беспрацоўных. Усе пералічаныя абставіны і мерапрыёмствы, бясспрочна, ўдаюць імпульс да росту рабочае сілы і разьвіцьця ўсіх зьвеньняў мясцовай прамысловасьці, а асабліва яе каапэрацыйнага сэктару.

Зусім зразумела, што рост колькасьці прадпрыёмстваў і рабочае сілы па мясцовай прамысловасьці, пры адначасовай рацыяналізацыі мэтадаў вытворчасьці і мэханізацыі саміх прадпрыёмстваў павінна адбіцца і на росьце намечанай да выпрацоўкі яе прадукцыі.

Агульны прырост намечанай да выпрацоўкі прадукцыі за пяцігодзьдзе намячаецца ў 135,7 проц., з іх мы маем найбольш на прамысловасьці АВК і РВК (+164,8 проц.) крыху меншы—на каапэрацыйнаму сэктару (+131,6 проц.) і больш абмежаваны рост—на працкалектывах (+121,1 проц.).

Асноўнымі галінамі вытворчасьці ў мясцовай прамысловасьці (за пяцігодзьдзе) трэба лічыць: вопратка і туалет (19,5 проц.), „пищевкусовая" (18,2 проц.), абутковa-скураная (17,2 проц.), дрэваапрацоўваючая (10,08 проц.) і г. д., здабываньне і апрацоўка лёну і пянькі (4 проц.), вытворчасьць фізічных сіл (электрэнэргія і вадазабясьпека 3,1 проц. і г. д.

Да асобных галін прамысловасьці, маючых базіс далейшага разьвіцьця, пры адначасовым павялічэньні таварнасьці сялянскай гаспадаркі, трэба далічыць бульбаапрацоўваючую (крахмальна-патачныя заводы) і лёнаапрацоўваючую. Павялічэньне пасеваў лёну і яго ўраджаю будуць мець у выніку павялічэньне валавай прадукцыі лёну-валакна ў БССР з 2,5 млн. пудоў у 1925-26 г. да 40 мільёнаў пудоў у 1931 г.; таварная прадукцыя валакна павялічыцца з 232 тыс. пуд. у 1925-26 г. да 1447 пуд. у 1931 г. (даныя Дзяржплану БССР). Пры гэткіх пэрспэктывах лёнаводзтва мяркуецца на лініі мясцовай прамысловасьці пабудаваць некалькі заводаў на першай апрацоўцы лёну і пянькі (лёнатрапальныя, часальныя заводы ў Віцебскай, Полацкай і іншых раёнах). З асобных галін «пищевкусовай» прамысловасьці (апрача крахмальна-патачнай, памянёнай вышэй) маюць пэрспэктывы наступныя вытворчасьці: цукерныя, перапрацоўка мяса, рыбы, апрацоўка садавіны, кансэраваньне іх, сушэньне, вырабі павідла і віна. Наліччa садавіны, гародніны, прадуктаў жывёлаводзтва зьяўляецца дастатковай базай для разьвіцьця гэтага роду прамысловасьці. Нашы бойні ў буйных гарадох павінны быць тымі мясным кансэрвовымі заводамі (вакцтаат бойняў Заходняй Эўропы), у якіх скарыстоўваюцца літаральна ўсе адходы ад убою жывёлы (кроў, рогі, капыты, шчаціна і інш.). У адчыненьні для гэтай мэты дапаможнай вытворчасьці павінна быць наладжана вырапоўка тузінкаў, грэбянёў, шчотак, каўбас і розных мясных кансэрваў.

У мясцовай прамысловасьці могуць быць з посьпехам разьвіты заводы на выпрацоўцы экстрактаў (журавінкага і інш.), выбіраньне і сушэньне грыбоў, якія ў даваенны час давалі значны прыбытак і зьяўляліся экспартнымі таварамі.

Мукамольная прамысловасьць мае на Беларусі вельмі малыя пэрспэктывы разьвіцьця з прычыны дэфіцытнасьці хлеба-фуражнага балянсу. Такім чынам, млыны ў гарадох пры ўвозе мукі ня маюць асаблівых пэрспэктыў, што-ж датычыцца млыноў у райёнах, па перамолу сялянскага збожжа, дык іх нагрузка залежыць ад ураджаю.

Махорачная прамысловасьць ва ўмовах мясцовай прамысловасьці, прымаючы пад увагу абмежаванасьць мясцовага рынку і значную выпрацоўку такой-жа прадукцыі на фабрыках рэспубліканскай прамысловасьці маюць вельмі слабыя пэрспэктывы разьвіцьця ў далёкішым і за пяцігодзьдзе застаюцца стабільнымі.

Вялікая колькасьць лясоў на Беларусі спрыяе разьвіцьцю галін прамысловасьці, перапрацоўваючых і апрацоўваючых драўніну—лесапільні, бачарная, калодачная, цьвікоўная, скрынёва-стружачая, каретная і г. д. прамысловасьці. Калі лесапільні ў мясцовай прамысловасьці маюць тэндэнцыю да зьніжэньня, за адсутнасьцю выстарчальнае сыравіны, дык усе-ж дрэваапрацоўваючая прамысловасьць мае шырокую пэрспэктыву разьвіцьця.

Значнае пашырэньне ў будучым намячаецца ў лесамэханічнай прамысловасьці, шляхам разьвіцьця смаляраў і выпрацоўкі шпігінару, канфолі, а таксама дубільных экстрактаў, неабходных для мясцовых скураных заводаў.

Надзвычайна шпаркі рост маем па галіне прамысловасьці, выпрацоўваючай будаўнічыя матар'ялы. Пэрспэктывы разьвіцьця гэтай галіны ўсім відавочны, калі ўлічыць патрэбы рынку ў будаўнічых матар'ялах для жыпрамбудаўніцтва. У параўнаньні з даваеннай выпрацоўкай па гэтай галіне прамысловасьці мы яшчэ вельмі адсталі і зусім зразумела, што на бліжэйшыя гады пэрспэктывы разьвіцьця яе забясьпечаны.

Шырокія пэрспэктывы разьвіцьця мае таксама галянтарэйная прамысловасьць, якая палкам павінна быць далучана да мясцовай, шляхам яе ўзбуйненьня існуючых прадпрыёмстваў і большай мэханізацыі працасаў выпрацоўкі, бо ў сучасны момант яна распылена на дробных саматужных прадпрыёмствах.

Геаграфічны стан прамысловых цэнтраў за пяцігодзьдзе намячаецца паступны: Менск, Віцебск, Гомель, Магілеў, Бабруйск.

Пераходзячы да пытаньня пэрспэктыўнага праектаваньня капітальнага будаўніцтва на пяцігодзьдзе на мясцовай прамысловасьці, трэба зазначыць на тое, што прыходзілася падыходзіць як у адносіне рэканструкцыі ўжо існуючых, пуску ў ход прадпрыёмстваў, якія знаходзяцца на кансэрвацыі, так і да новых аб'ектаў будаўніцтва, галоўным чынам, з пункту погляду неабходнага здавальненьня неадкладных патрэб.

У цэлым пэрагру гарадоў БССР за пяцігодзьдзе намячаецца канцэнтрацыя энэргетычных баз (Менск,

ЗАКОНЫ І ЗАГАДЫ ЎРАДУ БССР

ПАСТАНОВА

САВЕТУ НАРОДНЫХ КАМІСАРАЎ БССР

ПРА МЕРАПРЫЁМСТВЫ ДЛЯ ВЫКАНАНЬНЯ ПАСТАНОВЫ СНК СССР ЗА 19-ГА КАСТРЫЧНІКА 1928 Г. ПА ДАКЛАДУ ЎРАДУ БССР.

Каб хутчей ажыцяўляць дырэктывы Савету Народных Камісараў Саюзу ССР, Савет Народных Камісараў БССР пастанаўляе даручыць усім народным камісарыятам, цэнтральным установам і Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры СНК БССР у сваёй бягучай дзейнасьці, а таксама пры разглядзе пяцігадовага і гадовых плянаў ажыцьцяўляць дырэктыву СНК СССР аб больш рашучым разгортваньні працы для палепшаньня і ўзмацненьня паасобных галін народнае гаспадаркі БССР, для чаго:

1. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства БССР:

а) на працягу 3-х тыдняў распрацаваць плян канкрэтных мерапрыёмстваў для падвышэньня ўраджайнасьці, пашырэньня ўжываньня зялёных, мінэральных і торпавых угнаеньняў, разьвіцьця прадукцыйнай жывёлагадоўлі, а таксама тэхнічных і працаёмістых культур, рацыёнізацыя прамысловага будаўніцтва для пераапрацоўкі сельска-гаспадарчага сыру, пашырэньня і ўзмацненьня канцэрацыйнага будаўніцтва і будаўніцтва калектыўных гаспадарак;

б) на працягу месяца распрацаваць і падаць у СНК плян мерачрыёмстваў для ўзмацненьня агранамічнага абслугоўваньня насельніцтва;

в) разам з Вышэйшым Саветам Народнай Гаспадаркі на працягу месяца распрацаваць і падаць у СНК БССР перспэктыўны плян будаўніцтва па мінэральным угнаеньні, шырока ўдзігнуўшы ў гэтую справу канцэрацыю і сродкі мясцовага насельніцтва;

г) на працягу шасьці тыдняў распрацаваць і падаць у СНК БССР канкрэтныя прапановы аб мерапрыёмствах патрэбных для: 1) больш шырокага разгортваньня мэліярацыйных работ, 2) больш рэнтабельнага скарыстаньня сродкаў, якія адпушчаюцца на мэліярацыйныя работы, 3) большага ўцягваньня сродкаў сялянскага насельніцтва ў мэліярацыйныя работы, якія праводзяцца мэліярацыйнымі таварыствамі, 4) узмацненьня фінансаваньня мэліярацыі сялянскіх земляў, 5) далейшага разгортваньня сеткі і палепшаньня якаснай працы мэліярацыйных таварыстваў;

д) на працягу шасьці тыдняў распрацаваць і падаць у СНК БССР праз Дзяржаўную Плянавую Камісію пры СНК БССР плян паскарэньня правядзеньня землеўпарадкаваньня ў ільняводных раёнах, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на падвяцьце ўраджайнасьці лёну, разьвіцьцё ў ільняводных раёнах травасеяньня і жывёлагадоўлі, пашырэньне разьвядзеньня лёну ў калектыўных і савецкіх гаспадарках. Адначасова падаць у СНК канкрэтныя прапановы аб пашырэньні ільняной культуры ў савецкіх гаспадарках БССР наогул, а таксама аб магчымасьці пераводу некаторых савецкіх гаспадарак на пераважна ільняводчы ўхіл

е) разам з Народным Камісарыятам Гандлю на працягу двох месяцаў падаць даклад аб правядзеньні практычных мерапрыёмстваў для пачаткоўнага таварнага выхаду, загатоўкі і кантрактацыі лёну ў БССР;

ж) падаць у СНК БССР на працягу двох месяцаў даклад аб скарачэньні прынятых плянамі тэрмінаў лесаўпарадкаваньня, аб больш шырокім разгортваньні работ для лесаднаўленьня, правядзеньня лесакультурных мерапрыёмстваў і ахоны дзяржаўных лясоў і лясоў мясц. значэньня;

з) разам з Вышэйшым Саветам Народнай Гаспадаркі ўжыць захады да больш рацыянальнай эксплёатацыі лесу, праз больш складаную перапрацоўку драўніны, праз упарадкаваньне распрацоўкі лесасек і праз большае пашырэньне і ўзмацненьне лясной і лесахімічнай прамысловасьці і інш.;

і) на працягу двох месяцаў разам з Вышэйшым Саветам Народнай Гаспадаркі распрацаваць і падаць у Эканамічную Нараду праект мерапрыёмстваў далейшага ўзмацненьня і разьвіцьця сыстэмы сельска-гаспадарчага крэдыту, зьвярнуўшы асаблівую ўвагу на больш рацыянальнае скарыстоўваньне сродкаў і вывучэньне вынікаў укладзеньня у розныя галіны с. гасп.

2. Даручыць Народнаму Камісарыяту Земляробства БССР і Народнаму Камісарыяту Рабоча-Сялянскай Інспэкцыі ўзмацніць кантроль над работамі па землеўпарадкаваньню і па падняцьці ўраджайнасьці.

3. Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў разам з Народным Камісарыятам Земляробства на працягу 3-х тыдняў распрацаваць і падаць праз Дзяржаўную Плянавую Камісію ў СНК БССР прапановы аб утварэньні спэцыяльнага фонду фінансаваньня ўнутранай калёнізацыі БССР на мэліяраваных землях.

4. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі і Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры СНК БССР уключыць у пяцігодку народнай гаспадаркі дадатковыя канкрэтныя мерапрыёмствы для ўзмацненьня ролі прамысловасьці ў народнай гаспадарцы БССР, галоўным чынам, тых галін, што карыстаюцца мясцовым сырцом, а таксама для арганізацыі ў БССР прадпрыёмстваў, якія карыстаюцца прывозным сырцом і паўфабрыкатамі.

5. Даручыць Вышэйшаму Савету Народнай Гаспадаркі ўжыць захады да паскарэньня будаўніцтва тых прадпрыёмстваў для вырабу мінэральных угнаеньняў, якія вызначаны для будаўніцтва.

6. Даручыць Эканамічнай Нарадзе пры СНК БССР на працягу двох месяцаў прыняць шэраг канкрэтных мерапрыёмстваў для рацыяналізацыі тавараправоднага апарату і для больш поўнага і лепшага абслугоўваньня ім насельніцтва.

7. Даручыць Беларускаму саюзу саматужна-прамысловай кааперацыі на працягу месяца падаць у Эканамічную Нараду пры СНК БССР праект мерапрыёмстваў для пашырэньня кааперавання саматужнікаў, лепшага абслугоўваньня іх, больш рэгулярнага забясьпечаньня сырцом і арганізаванага збыту іх прадукцыі.

8. Даручыць Народнаму Камісарыяту Гандлю БССР на працягу двох месяцаў распрацаваць і падаць у Савет Народных Камісараў плян капітальнага будаўніцтва на экспарту з адпаведнасьці з пастановаю СНК СССР па дакладу Ўраду БССР, адначасна ўжыць захады да пашырэньня экспарту асабліва другарадных галін.

9. Даручыць Дзяржаўнай Плянавай Камісіі пры СНК БССР у канцы 1929 г. падрыхтаваць усе матар'ялы аб патрэбе пабудаваньня ў БССР другой раённай электрычнай станцыі на торпавым масыве.

10. Даручыць Начальніку Галоўнага Кіраўніцтва шосаў і грунтовых дарог на працягу месяца падаць у СНК БССР плян дарожна-будаўнічых работ на 1928-29 год у адпаведнасьці з зацьверджаным СНК БССР пяцігадовым плянам дарожнага будаўніцтва.

11. Даручыць Упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Шляхоў пры СНК БССР на працягу шасьці тыдняў увайсьці з дакладам у СНК БССР аб аднаўленьні Бярэзінскай водная сыстэмы.

12. Даручыць Упаўнаважанаму Народнага Камісарыяту Пошт і Тэлеграфу пры СНК БССР на працягу двох месяцаў падаць у СНК БССР даклад аб стане ў БССР усіх відаў сувязі і праект патрэбных мерапрыёмстваў да іх пашырэньня і палепшаньня.

13. Даручыць Камітэту па справах друку пры СНК БССР на працягу месяца падаць праект мерапрыёмстваў для ўзмацненьня асноўных і зваротных сродкаў Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва.

14. Даручыць Народнаму Камісарыяту Фінансаў і Народнаму Камісарыяту Працы на працягу трох дзён падаць у СНК прапановы аб сродках патрабных на павялічэньне паводле пастановы СНК БССР, заработнае платы сельскага настаўніцтва, раённых агранамаў, вучастковых дактароў і вэтэрынарнага персаналу, які працуе ў сельскіх мясцовасьцях БССР.

15. Даручыць Камісіі, утворанай пастановай СНК БССР за 30-га красавіка 1928 г. (прат. расп. пас. СНК № 54, п. 736), ужыць захады да скарэйшага сканчэньня падрыхтоўчай работы па пабудаваньні дому ўраду (сканчэньне праектаў, абвяшчэньне конкурсу і г. д.), падаўшы праз тры тыдні ў СНК даклад аб праробленай працы.

16. Народныя камісарыяты, цэнтральныя ўстановы і акруговыя выканаўчыя камітэты павінны ўжыць захады да ўсебаковага растлумачэньня гэтай пастановы ўсім савецкім установам і супрацоўнікам, даўшы канкрэтныя дырэктывы і паказаньні аб выкананьні паасобных пунктаў пастановы.

Старшыня СНК БССР М. Галадзед.
Нам. Кіраўніка Справаў СНК і Эканамічнай Нарады БССР Л. Дубавіцкі.
31 кастрычніка 1928 г., г. Менск.

ХРОНІКА.

Падрыхтоўка да кастрычнікаўскіх урачыстасьцяў.

Нямецкія госьці на Кастрычнік.

У кастрычнікавыя дні ў Менск прыяжджае дэлегацыя нямецкіх мэталёўцаў, запрошаных рабочымі заводу „Метал".

Харкаўскім пралетарыям ад рабочых сталіцы Беларусі.

Дэлегацыя менскіх рабочых выедзе на Кастрычнікавае сьвята, згодна запросін Харкаўскага гарсавету, у Харкаў. Дэлегацыя перадасьць харкаўскім пралетарыям сьцяг ад імя рабочых сталіцы Савецкае Беларусі.

Радыё ў кастрычнікаўскія дні.

Радыёперадача ўжо распачала перадачу па радыё лекцый і гутарак аб дасягненьнях БССР да 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

6-га лістапада а 6-й гадзіне ўвечары радыё-перадача БССР будзе перадаваць з Дому Культуры ўрачыстае пасяджэньне Ўраду і гарсавету, а пасьля будзе прымаць прывітаньне з Масквы, Харкаву, Ленінграда і Тыфліса.

На Плошчы Волі і Савецкай вуліцы будуць устаноўлены гучнагаварыцелі, што дасьць магчымасьць слухаць усім жадаючым.

Сходы, прысьвечаныя сьвяту Кастрычніка.

У сучасны момант па прадпрыёмствах, установах і школах адбываюцца сходы, прысьвечаныя сьвяткаваньню 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

У нядзелю, 4-га лістапада, у клюбе Карла Маркса адбудзецца ўрачысты агульнагарадзкі студэнцкі сход, на якім будзе заслуханы даклад аб гаспадарчым будаўніцтве СССР і БССР.

Новыя крахмальныя заводы да сьвята Кастрычніка.

Зараз заканчваецца набудова 2 новых крахмальных заводаў у савецкіх гаспадарках Веслова (Менская акруга) і Дурыничы (Бабруйская акруга).

Урачыстае адчыненьне гэтых крахмальных заводаў адбудзецца ў дні сьвяткаваньня 11-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі.

Распрацоўка 5-цігадовага пляну прамысловасьці.

У Менск прыехалі т. т.: Яфімаў—куратар ВСНГ СССР па Беларусі, Рабіновіч—намесьнік начальніка эканамічнага аддзелу ВСНГ СССР і прадстаўнік ад эканомікі працы ВСНГ СССР.

ВСНГ БССР прыступіў разам з прадстаўнікамі ВСНГ СССР да распрацоўкі кантрольных лічбаў 5-цігадовага прэспэктыўнага пляну прамысловасьці Беларусі.

Матар'яльная дапамога літаратурным аб'яднаньням.

Наркамасьветы БССР адпусьціў літаратурным аб'яднаньням 11.000 руб. субсыды. З агульнай сумы адпушчана аб'яднаньню „Полымя"—3500 руб., «Маладняку»—3500 руб., «Узвышшу»—2000 руб., яўрэйскай сэкцыі „ВАПП" у БССР—1200 руб. і польскай сэкцыі «ВАПП»—800 руб.

Падрыхтоўка артыстаў для Белдзяржтэатраў.

У мэтах падрыхтоўкі артыстаў з пачынаючых працаўнікоў клюбных сцэн НКА ўвёў у штат першага Белдзяржтэатру 4 пасады практыкантаў і ў Беларускі Дзяржаўны яўрэйскі тэатр 8 пасад практыкантаў. Практыкантам будзе выплачвацца штомесяц пэнсія ў разьмеры 45 руб.

На пасаду практыкантаў будуць прымацца працаўнікі клюбных і іншых сцэн, а таксама і праз конкурсы.

У акруговай нацкамісіі.

Беларусізацыя адміністрацыйных частак акрвыканкому.

На апошнім пасяджэньні Менскай акруговай камісіі быў заслуханы даклад начальніка адміністрацыйнага аддзелу АВК аб беларусізацыі адміністрацыйных частак акрвыканкому.

Акруговая нацкамісія адзначыла, што канцэлярскі апарат раённаў поўнасьцю пераведзен на беларускую мову. Аднак праца міліцыянераў і агэнтаў крымінышку па беларускай мове яшчэ недастаткова і патрабуе пагыбленьня і пашырэньня яе.

Акруговая нацкамісія запрапанавала адміністрацыйнаму аддзелу прыняць захады да палепшэньня беларусізацыі ў адміністрацыйных частках.

Арганізацыя нацкамісіі ў Барысаве.

Акруговая нацкамісія пастанавіла ўтварыць у Барысаве нацкамісію на прынцыпу акруговай нацкамісіі. Склад гэтай нацкамісіі пастаноўлена ўнесьці на зацьверджаньне ў прэзыдыум АВК.

Адчыненьне новых нацшкол.

Менская акруговая нацкамісія пастанавіла адчыніць нулявую групу пры Вузьдзенскай яўрэйскай сямігодцы і школ—прымітывак.

Латыскай—у Барысаўскай і расейскай—у Халопяніцкім раёне.

Як праходзіць падпіска на творы Леніна.

Кампанія па падпісцы на творы Леніна на беларускай мове разгортваецца. Пасьпешна падпіска праходзіць па Менску. Так, на 1-га лістапада ўжо падпісалася на 364 камплекты Леніна. Па акругах кампанія па падпісцы яшчэ недастаткова разгарнулася. Лепш падпіска праходзіць на Мазырскай (44 камплекты), Полацкай (30 камплектаў), Бабруйскай (35 камплектаў) і Гомельскай (26 камплектаў). Слаба праходзіць падпіска па Віцебскай (13 камплектаў) і Магілеўскай (13 камплектаў).

Адказны рэдактар М. КУДЗЕЛЬКА

КІНО-ТЭАТР КУЛЬТУРА

5-га лістапада ПАНЯДЗЕЛАК. — 5-га лістапада ПАНЯДЗЕЛАК.

Вялікі вечар беларускай мастацкай літаратуры і музыкі.

1-я ЧАСТКА.

ПРАЧЫТАЮЦЬ СВАЕ НОВЫЯ ТВОРЫ:

Народны паэт рэспублікі—Янка Купала, народны паэт рэспублікі—Яўбу Колас, Цішка Гартны, Міхась Чарот, Міхась Зарэцкі, Зьмітрок Бядуля, Міхайла Грамыка, Андрэй Александровіч, Алесь Дудар, Алесь Гурло, Крапіва, Кузьма Чорны, Нёманскі, В. Каваль, Паўлюк Трус, С. Фамін, А. Гародня, М. Хведаровіч і інш.

Уступнае слова Нам. Наркамасьветы т. ЖЫЛУНОВІЧА.

2-я ЧАСТКА.

Канцэртнае аддзяленьне пры ўдзеле артыстых сьпевакоў і балету БДТ-1.

1. Вакальны квартэт БДТ-1 Мацылевіч, Мікалаевіч, Патапаў, Швайко—народныя сьпевы.
2. Цымбалы соло—артысты Жыдовіч.
3. Бел. сьпевы—артыстка Марцыновак.
4. Беларускія сьпевы—пад акампанімэнт гармоніі ў вык. тэнара Рубінштэйна.
5. Сьпевы—соло—В. А. Сэлях.
6. Беларускія скокі—Хіраска, Кізіна, Узунава, Лушачкова.
7. Аркестр цымбал, лер і жалеек Музычнага Тэхнікуму пад кіраўніцтвам Захара.

Кошт білету ад 20 к. да 1 р. 50 к. Пачатак а 8-й гадзіне ўвечары.
Распранацца абавязкова.
Білеты прадаюцца ў рабочай касе, клюбе навуковых працаўнікоў і ў дзень вечару ў кіно-тэатры «Культура» з 2—4 і 5—8 гадзін.
Увесь збор пойдзе на карысьць Шэфтаварыства Працасьветы.

БЕЛДЗЯРЖТЭАТР.

СУБОТА 3 лістапада. — На карысьць незаможных вучняў 4-й сямігодкі **МЯЦЕЖ** рэвалюцыйная п'еса ў 7 абразох, з часоў кулацкага паўстаньня ў г. Верным у 1920 г. Астача білетаў у касе тэатру ад 6 г. увечары.

КІНО-ТЭАТР «КУЛЬТУРА». — 3 аўторка, 30-га кастрычніка НОВЫ МАСТАЦКІ ФІЛЬМ **АСЯ** ДРАМА Ў 7 ЧАСТКАХ. Звыш праграмы: толькі 6 гастроляў Н. В. ДУЛЬКЕВІЧ.

КІНО „ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА". — 3 аўторка 30 кастрычніка. НОВЫ НЯМЕЦКІ БАЯВІК ПЕРШЫМ ЭКРАНАМ У СССР. Маштацкі спартыўны фільм **„11—ЧАРЦЕЙ—11"**. Звыш праграмы—кіно-хроніка. 3 сэансы—Пачатак 1-га сэансу а 7 г., 2-га а 8 г. 45 м., 3-га а 10 г. 30 м. Каса ад 5 гадз.

КІНО «ІНТЭРНАЦЫЯНАЛ». — 3 аўторка, 30-га кастрычніка Новая мастацкая пастаноўка савкіно. **„ПРЫНЦ ПАЛКІХ МАРАЎ"** (Знойны прынц) маст. драма ў 7 частках. Звыш праграмы—кіно-хроніка. 3 сэансы—пачатак 1-га а 7 г., 2-га а 8 г. 45 м, 3-га а 10 г. 30 м. Каса ад 5 гадз.

1-ы ДЗІЦЯЧЫ КІНО-ТЭАТР „ЮНЫ ПІАНЭР" — **АНЯ** драма ў 6 частках. Звыш праграмы—кіно-хроніка «Совкино».

КЛЮБ К. МАРКСА.

У суботу 10-га лістапада адбудзецца

ПЕРШЫ Ў СЭЗОНЕ **ВЯЛІКІ КАНЦЭРТ**

У ДВУХ АДДЗЯЛЕНЬНЯХ

пры ўдзеле ЛЕПШЫХ КАНЦЭРТНЫХ СІЛ ПЕРШАГА БЕЛАРУСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА ТЭАТРУ І БЕЛМУЗТЭХНІКУМУ.

У канцэрце прымаюць удзел артысты-салісты сьпевакі: запрошаная з Ленінграду Л. А. Васільчанка (м. сапрано), артыст К. І. Мацялевіч (тэнар), артыстка Л. Р. Янушкевіч (народныя сьпевы), В. А. Сэлях (барытон-бас), салісты балету Л. А. Брэві і Ю. К. Сямёнаў; артысты балету Ю. І. Хэраска, Кізіна, Узумава, Глушачкова; цымбалісты Жыдовіч; Беларускі вакальны квартэт у складзе артыстаў: М. І. Мікалаевіча, У. У. Патапава, П. І. Швайко і К. І. Мацялевіча, каля раяю канцэртмайстар БДТ-1 Р. А. Шалыт.

Выкладчыкі музтэхнікуму: А. Л. Бясьмертны (скрыпка), М. М. Вастокаў (бас), Я. Л. Жыў (раяль) і С. Л. Жыў (скрыпка), сьпявачка Л. А. Александроўская (сапрано); і М. М. Пігулеўскі (барытон), аркестры цымбал, жалеек і лер пад кіраўніцтвам А. Л. Ягорава.

У антрактах іграе аркестр Аб'яднанай Вайсковай Школы імя ЦВК і СНК БССР.

УВЕСЬ ЧЫСТЫ ЗБОР АД КАНЦЭРТУ ПОЙДЗЕ НА КАРЫСЬЦЬ БЯДНЕЙШЫХ ВУЧНЯЎ ЦЭНТРАЛЬНАЙ ДАСЬЛЕДЧАЙ ШКОЛЫ.

ПАЧАТАК А 9-Й ГАДЗІНЕ.

Кіраўнік канцэрту: Дырэктар БДТ-1 В. А. СЭЛЯХ.

Адказны за канцэрт: Загадчык Ц. Д. Школы І. К. Самковіч.

Апавяшчэньні.

ДОМ АСЬВЕТЫ.

— Занятні гуртка ангельскай мовы будуць адбывацца па нядзелях і пятніцах ад 5—7 гадз. увеч. пунктуал.

— 3-XI. Нямецкая мова ад 5 гадз.

— Сёньня, роўна а 6 гадз. увечары, пачынае сваю працу менская акруговая канфэрэнцыя Саюзу Працаўнікоў Асьветы, якою будзе заслухана 1-е пытаньне абвестні дню—«Палітычны даклад».

Запрашаюцца асьветнікі гор. Менску.

КАНТОРА ГАЗЭТЫ „САВЕЦКАЯ БЕЛАРУСЬ".

даводзіць да ведама падпісчыкаў МСЬЦІСЛАЎСКАГА ... ключна падрыхтаваючых грамадзкія на... павінен зацікавіцца г... прымяць з свайго боку

што наступныя нумары лётарэі ня будуць прымаць удзел у розыгрышы лётарэі 15-га студзеня 1929 г.

з прычыны адмовы Мсьціслаўскага Райкому Саюзу Працасьветы ад падпісі, зробленай ім для настаўнікаў вясковых школ Мсьціслаўскага району.

НУМАРЫ БІЛЕТАЎ:

240, 241, 242, 243, 244, 245, 246, 247, 248, 249, 250, 251, 252, 253, 254 255, 256, 257, 258, 259, 260, 261, 262, 263, 264, 265, 266, 267, 268, 269 270, 271, 272, 273, 274, 275, 276, 277, 278, 279, 280, 281, 282, 283, 284, 285 286, 287, 288, 289, 128, 126, 114, 127, 130, 1, 1101.

АБАВЯЗКОВАЯ ПАСТАНОВА № 29

МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА САВЕТУ

1-га ЛІСТАПАДА 1928 г.

У зьвязку са сьвяткаваньнем адзінаццацігодзьдзя Кастрычнікавай рэвалюцыі Менскі Гарадзкі Савет ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Гандаль дзяржаўны, кааперацыйны і прыватны спыніць з 20-ці гадзін увечары 6-га лістапада і на ўвесь дзень 7-га і 8-га лістападу, за выключэньнем наступных магазынаў, якія павінны быць адчынены у чацьвер, 8-га лістападу:

А) АД 9-ЦІ ДА 17 ГАДЗІН БЕЗ ПЕРАПЫНКУ.

1. МЦРК № 40—рог Ленінскай і Пл. Волі д. № 1-9.
2. » » 11 » Савецкай і Камароўск. вул. д. № 2.
3. » » 21—» Маскоўская вул. д. № 43.
4. » » 12— вул. Крапоткіна д. № 40.
5. » » 6— Кажэвенная вул. д. № 7-а.
6. Інвалідн. арцелі „Перамога" № 5—Савецкая вул. д. № 35.

Б) АД 9-ЦІ ДА 15 ГАДЗІН БЕЗ ПЕРАПЫНКУ.

7. МЦРК № 39—рог Энгельса і Савецкай д. № 91.
8. » » 24— » Сьвярдлоўскай і К. Маркса д. № 15-1.
9. » » 28—Камсамольская вул. д. № 11.
10. » » 43—Суражскі базар.
11. » » 52—Савецкая вул. д. № 52.

Працкалектывы

12. Пякароў № 1—Камунальная вул. д. № 14-18.
13. » » 2—Савецкая вул. д. № 76.
14. » » 3—Савецкая вул. д. № 185.
15. » » 5—Суражскі базар.
16. » » 6—Інтэрнацыян. № 7.
17. » » 7—вул. Бухарына д. № 2.
18. » » 8—Вял. Татарская д. № 15-1.
19. » » 9—Н. Маскоўская д. № 62.
20. » » 10—Савецкая вул. д. № 35-5.
21. Куст.прам. арцелі «Колас» № 1—Школьная вул. д. № 12.
22. Куст.прам. арцелі № 2—Савецкая вул. д. № 127.

В) АД 9-ЦІ ДА 12-ЦІ ГАДЗІН.

23. Сельск.-гасп. калёнія «Зорка» № 2—Інтэрнацыян. д. № 2.
24. Менск. Сялян. Малоч. Т-ва № 1—Камсамольская вул. д. № 5.
25. Менск. Сялян. Малоч. Т-ва № 2—Савецкая вул. д. № 70.
26. Фэрмы Прылукі-Атоліна — Ленінская вул. д. № 28.
27. Інвал. арцелі «Перамога» № 4—Савецкая вул. д. № 62.

Г) АД 8-МІ ДА 23-Х ГАДЗ. БЕЗ ПЕРАПЫНКУ.

28. Ларок ТПО МБВ чыгункі № 4—Суражская в.
29. «Чырвонаарм. ларок» ТПО МБВ чыг. супроць вакзалу (быўш. Заходн. чыг.).

2. Кафэ-рэстараны, піўныя, закусачныя і сталоўкі зачыніць з 20-ці гадзін увечары 6-га лістапада і на ўвесь дзень 7-га і 8-га лістападу за выключэньнем сталовак:

а) МЦРК № 1—Інтэрнацыян. № 8.
б) „ № 2—рог Савецкай і Энгельса д. № 24-85.
в) „ № 3 Савецкая вул. д. № 68.
г) „ № 6 Ленінская вул. д. № 1-9

якія павінны быць адчынены, як у звычайны час.

3. Працу ў прадпрыёмствах, за выключэньнем тых, якія ня могуць быць зачынены, спыніць не пазьней 18-ці гадзін увечары 6-га лістападу і на ўвесь дзень 7-га і 8-га лістападу.

4. Працу ў цырульнях і фатаграфіях спыніць з 20-ці гадзін увечары 6-га лістападу і на ўвесь дзень 7-га і 8-га лістападу.

5. Дазволіць 4, 5 і 6 лістападу работу ва ўсіх цырульнях і фатаграфіях і гандаль ва ўсіх крамах без палудённага перапынку.

6. Дазволіць гандлёвым прадпрыёмствам, якія маюць выхадны дзень—нядзелю, ці аўторак—гандляваць 4 і 6 лістапада.

7. Нагляд за выкананьнем гэтай пастановы ўскласьці на міліцыю.

8. Вінаватыя ў парушэньні гэтай пастановы падлягаюць штрафу ў адміністрацыйным парадку да 100 рублёў, ці прымусовым працам да 1-га месяца.

Нам. Старшыні Менгарсавету РАБІНОВІЧ.

Сакратар ПАСЫНКОЎСКІ.

ПРЫМАЕЦЦА ПАДПІСКА НА 1929 ГОД НА

„ПОЛЫМЯ"

штомесячную беларускую часопісь літаратуры, палітыкі, эканомікі, гісторыі, крытыкі.

(ВОСЬМЫ ГОД ВЫДАНЬНЯ).

Пад рэдакцыяй: А. БАЛІЦКАГА, Я. ВАСІЛЕВІЧА, ЗЬМ. ЖЫЛУНОВІЧА (адказны рэдактар), ЯНКІ КУПАЛЫ, М. ЧАРОТА.

„ПОЛЫМЯ" знаёміць з дасягненьнямі ўсіх плыняў беларускай і чужаземнай мастацкай літаратуры, друкуючы раманы, аповесьці, новэлы, апавяданьні, п'есы, паэмы, вершы.

„ПОЛЫМЯ" друкуе матар'ялы па палітыцы, эканоміцы, гісторыі беларускай культуры і гісторыі рэвалюцыйнага руху Беларусі.

„ПОЛЫМЯ" зьмяшчае шмат навуковых матар'ялаў па філёзофіі, марксызьме і ленінізьме.

„У ПОЛЫМІ" чытач заўсёды знойдзе шмат крытычных матар'ялаў аб беларускай і інш. чужаземнай літаратуры.

„ПОЛЫМЯ" апрача матар'ялаў па літаратуры, палітыцы, эканоміцы, гісторыі, крытыцы дае на сваіх старонках багаты кнігапіс, бібліяграфію, занатоўвае ўсе зьявы беларускай культуры, дае хроніку культурнага жыцьця Украіны.

„У ПОЛЫМІ" прымаюць удзел самыя выдатныя літаратары, крытыкі, публіцыстыя і навуковыя сілы.

— З ПЕРШАГА ЛІПЕНЯ 1928 г. —

ЧАСОПІСЬ „ПОЛЫМЯ"

выходзіць штомесячна (12 кніжак на год)

РАЗЬМЕРАМ КОЖНЫ НУМАР 10-12 ДРУКАВАНЫХ АРКУШАЎ.

ПАДПІСНАЯ ЦАНА:

На год	12 руб. — кап.
„ 6 месяцаў	6 руб. 50 кап.
„ 3 месяцы	3 руб. 25 кап.

ЦАНА АСОБНАГА НУМАРУ 1 руб. 25 кап.

Падпісчыкі на часопісь «Полымя», якія прышлюць цалкам падпісную плату да 25 лютага 1929 г., атрымліваюць на гэты ж год па падпісных квітанцыях пры пакупцы мастацкай (Янкі Купалы, Якуба Коласа, Цішкі Гартнага і інш.) і палітычнай літаратуры выданьняў Беларускага Дзяржаўнага Выдавецтва наступныя ільготы:

Гадавыя падпісчыкі атрымліваюць скідку на 25 проц. (на агульную суму да 30 р.).

Паўгадавыя падпісчыкі 15 проц. (на суму да 20 руб.).

Акрамя таго, падпісчыкам на «ПОЛЫМЯ» на 1929 год, якія не карыстаюцца скідкай, даецца растэрмінаваньне з УПЛАТАЮ ГАДАВЫМ: да 1-га студзеня—5 руб., да 1-га ліпеня—4 руб. і да 1-га кастрычніка—3 руб.

Паўгадавым падпісчыкам да 1-га студзеня—4 руб. і да 1-га чэрвеня—2 руб. 50 кап.

ПАДПІСКА ПРЫМАЕЦЦА: У рэдакцыі часоп. «ПОЛЫМЯ» (Менск, Савецкая, 63, Белдзяржвыдавецтва), у цэнтральнай кнігарні Бел. Дзярж. Выдавецтва (Менск, вуг. Ленінскай і Савецкай), ва ўсіх акруговых аддзяленьнях Бел. Дзярж. Выдавецтва, у аддзеле падпіскі Беларускага Аддзяленьня ГІЗ'а РСФСР (Менск, Савецкая, 54) і яго агэнтурай па акругах і раёнах, ва ўсіх паштова-тэлеграфных канторах і аддзяленьнях, у Беларускім Аддзяленьні Выдавецтва „Известия" ЦИК і „Правда" (Менск, Савецкая, 61) і яго пададдзяленьнямі (Гомель, Савецкая, 17; Віцебск, Ленінская, 11), а таксама і контрагэнтамі (Бабруйск, Магілеў, Жлобін), у канторы газэты «Беларуская Вёска» (Менск, Савецкая, 63) і яе ўпаўнаважанымі і селькорамі ва ўсіх раёнах БССР.

ЗАОЧНЫЯ КУРСЫ БУХГАЛТЕРИИ, КАЛЬКУЛЯЦИИ И СТАТИСТИКИ

— Продолжительность курса—8 МЕСЯЦЕВ. —
— Поступать на курсы можно в любой месяц года. —
Принимаются лица с образованием не ниже 4 гр. семилетки.
ОКОНЧИВШИМ КУРСЫ ВЫДАЮТСЯ СВИДЕТЕЛЬСТВА.
Плата за первый месяц—5 руб., а за остальные по 4 руб. в месяц ВНОСИТСЯ В НАЧАЛЕ КАЖДОГО МЕСЯЦА ВПЕРЕД по адресу: МИНСК, ВОЕНКОБАНК, тек. счет № 682.
Подробные условия высылаются за 2 восьмикопеечные марки. С вопросами обращаться: Минск, Военкобанк, заочным курсам.

ПРАДАЕЦЦА зрыў-папера, макулатура і старыя газэты. Спытацца ў канторы газэты „Савецкая Беларусь" (Рог вуліц Карла Маркса і Ленінскай, 2-гі дом Саветаў).

ЗГУБЛЕНЫ.

— Пэнсійн. кніжка за № 66 Маміна М. А., выд. Сац. Забясьп., кв. 114.
— Кааперац. кніжка Кавалёўскай Ю. Ф., выд. МЦРК, кв. 115.
— Кааперац. кніжка Багданович Е. М., выд. МЦРК, кв. 116.
— Сяброўскі білет Цалівода М. І., выд. саюзам Рабіс, кв. 117.
— Біржавы нумер Старобінец Г. Э., выд. біржай працы, кв. 118.
— Вучотна-вайсковая кніжка Курмаєв С. І., выд. Мазырск. акрвенкамат., кв. 119.
— Вучотна-конская кніжка Тарасенка Д. Р., выд. Чэрвенск. вайсковым сталом, кв. 120.
— Сяброўская кніжка № 6637 Райкінай Г. М., выд. Барысаўскім ЦРК, кв. 121.
— Пасьведчаньне Зарэцкага Н. Р. аб сканчэньні агульна-адукац. курсаў у Калінкавічах, кв. 122.
— Кніжка за № 238 Фонюк—Лютаровіч Т., выд. Барысаўск. адз. страхкасы на кармленьне дзіцяці, кв. 123.
— Сяброўская кніжка № 5174 Рубінчыка М. Д., выд. Барысаўск. ЦРК, кв. 124.

Глаўлітбел 302.

2-я дзяржаўная друкарня.